Муамар

КАДДАФІ

Зялёная Кніга

Частка першая
Дэмакратыя
“Улада народа”

Частка друга
Вырашэние
эканамічнаи
праблемы
“Сацыялізм”

Частка трэцця
Грамадскі аспект
трэцяи сусветнан
тэорыі

ЗЯЛЁНАЯ КНІГА

Муамар КАДДАФІ

ЗЯЛЁНАЯ КНІГА

Частка першая

ДЭМАКРАТЫЯ

(Улада народа)

ПАЛІТЫЧНЫ АСПЕКТ ТРЭЦЯЙ СУСВЕТНАЙ ТЭОРЫІ

ПРЫЛАДА КІРАВАННЯ

"Галоўная палітычная праблема чалавечага грамадства - гэта праблема прылады ўлады".

"Нават сямейныя канфлікты нярэдка народжаны гэтай праблемай."

"Гэтая праблема стаіць з усёй сур'ёзнасцю з самага моманту ўзнікнення сучастных грамадстваў."

У наши дні народы і грамадствы пастаянна сутыкаюцца з гэтай праблемай, падвяргаюыся рызыцы і пакутуючы ад тых цяжкіх вынікаў, да якіх яна прыводзіць. Да цяперашняга часу не ўдалося знайсці канчатковага дэьакратычнага вырашэння гэтай праблемы. Зялёная Кніга дае канчатковае вырашэнне праблемы прылады ўлады.

Усе існуючыя зараз у свеце палітычныя сістэмы з'яляюцца параджэннем барацьбы за ўладу паміж прыладамі кіравання - ці то мірная або ўзброеная барацьба класаў, кланаў плямёнаў, партый ці проста асобных людзей. Пераможцам у ёй заўсёды выходзіць прылада кіравання - асоба, група людзей, партыя, клас, пераможаным жа заўсёды аказваецца народ, г. зн. сапраўдная дэмакратыя.

Палітычная барацьба у выніку якой перамагае, напрыклад, кандыдат, які набраў 51% галасоў выбаршчыкаў, прыводзіць да ўсталявання дыктатарскай прылады кіравання, апранутай у фальшывую тогу дэмакратыі, паколькі 49% выбаршчыкаў аказваюцца пад уладай прылады кіравання, за якую яны не галасавалі, а яка была ім навязана, а гэта і ёсць дыктатура. Палітычная барацьба такога роду нярэдка заканчваецца перамогай той прылады кіравання, якая ўяўляе меншасць, што адбываецца ў тым выпадку, калі галасы размяркоўваюцца паміж групай кандыдатаў, прычым адзін з іх атрымлівае галасоў больш, чым кожны іншы, асобна ўзяты. Калі ж падсумаваць галасы, пададзеныя за астатніх кандыдатаў, то акажацца, што яны складаюць пераважную большасць, аднак лічыцца, што перамог першы кандыдат і перамог, да таго ж, законным дэмакратычным

шляхам! А на справе - у наяўнасці дыктатура ў фальшывым абліччы дэмакратыі. Такі сапраўдны твар існуючых у сённяшнім свеце палітычных рэжымаў. Ці ж незразумела, што ўсе яны фальсіфікуюць сапраўдную дэмакратыю і з'яўляюцца дыктатарскімі рэжымамі.

ПАРЛАМЕНТЫ

ПАРЛАМЕНТЫ

Парламенты складаюць аснову існуючай традыцыйнай сучаснай дэмакратыі, але прадстаўніцтва народа ў парламентах з'яўляецца падманам, а парламентарызм - гэта заганнае вырашэнне праблемы дэмакратыі.

Ніякага прадстаўніцтва ад імя народа.

Прадстаўніцтва - гэта падман.

Асноўнае прызначэнне парламента - выступаць ад імя народа, што само па сабе недэмакратычна, паколькі дэмакратэя азначае ўладу самога народа, а не ўладу тых, хто выступае ад яго імя. Сам факт існавання парламенту азначае ўладу без народа. Сапраўдная дэмакратыя магчыма толькі пры ўдзеле самога народа, а не яго прадстаўнікоў.

Парламенты сталі ўзаконеным бар'ерами які перашкаджае народу ажыццяўляць сваю ўладу, адарваў масы ад удзелу ў палітыцы і манапалізаваў іх уладу. Народу пакінута чыста знешняе фальсіфікаванае праяўленне дэмакратыі - права на стаянне ў доўгіх чэргах

Праламент - гэта не ўлада народа.

да скрыняў на выбарчых участках.

Каб выявіць сапраўдную сутнасць парламента, неабходна звярнуцца да яго вытокаў. Парламент выбіраецца альбо ўсім насельніцтвам у выбарчых акругах, альбо партыя ці кааліцыяй партый, альбо прызначаецца. Усе гэтая метады не могуць лічыцца дэмакратычнымі, бо размеркаванне населеніцтва па выбарчых акругах азначае, што адзін дэпутат прадсталяе тысячы, сотні тысяч і нават мільёны людзей, у залежнасці ад колькасці выбаршчыкаў. Гэта значыць, што дэпутат зусім не звязаны з выбарашчыкамі ніякіамі цеснымі арганізацыйнымі сувязямі, паскольк ён, як і ўсе астатнія дэпутаты, лічыцца прадстаніком усяго народа. Такое патрабованне пануючай традыцыйнай дэмакратыі. З-за гэтага масы цалкам адарваны ад дэпутата, а дэпутат, толькі аграмаўш галасы выбаршчыкаў, канчаткова адрываецца ад мас. Ён манапалізуе ўладу мас і права вырашаць за іх справы.

Парламенты - фальсіфікацыя дэмакратыі

Такім чынам, мы бачым што традыцыйная дэмакратыя, якая пануе ў сучасным свеце забяспечвае члену парламента недатыкальнасць і акружае яго арэолами свяшчэннасці, адмаўляючы ў тым жа самым простым людзям. Гэта азначае, што парламенты сталі сродкам узурпацыі прысваення ўлады народа і, такім

чынам, народы маюць права шляхам народная рэвалюцыі змагацца ў імя таго, каб сакрушыць называемыя парламентамі прылады манапалізацыі дэмакратыі парушэння суверэннай волі мас, і абвясціць на ўвесь голас новы прынцып - **НЯКАГА ПРАДСТАЎНІЦТВА АД МЯ НАРОДА!**

Калі парламент сфармірованы партыяй, якая перамагла на выбарах, дык ён з'яўляецца не народным парламентам, а парламентам партыйным і прадстаўляе гэту партыю, а не народ. Выканаўчыя органы ўлады, прызначаныя такім парламентам, прадстаўляюць уладу перамагшай партыі, а не ўладу народа.

Тое ж самае тычыцца і парламента, у якім кожная партыя атрымлівае пэўную колькасць месц. Заняўшыя гэтая месцы дэпутаты з'яўляюцца прадстанікамі сваіх партый, а не прадстаўнікамі народа. Органы ўлады, утвораныя кааліцыяй партый, прадстаўляюць уладу кааліцыйных партый, а не ўладу народа. Народ ва ўмовах такіх рэжымаў становіцца ахвярай міжусобнай барацьбы. Выкарыстоўваючы народ у барацьбе за ўладу, палітычныя сілы, якія проціборствуюць, падманваюць і эксплуатуюць яго, каб атрымаць ягоны голас. Між тым людзі, накшталт ружанца, паслухмяна рухаюцца ў доўгіх чэргах, каб кінуць

у выбарчыя скрыні свае бюлетэні, - таксама ж, як яны, кідаюць абрыкі паперы ў скрыні для смецця. Такая традыцыйная дэмакратыя, якая пануе ў сённяшнім свеце, хай гэта будуць аднапартыйныя, двухпартыйныя ці шматпартыйныя сістэмы, або сістэмы, што наогул не маюць партый. Адсюль вынікае, што **ПАРЛАМЕНЦКАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА - ПАДМАН.** Што ж датычыць парламентаў, якія фарміруюцца шляхам прызначэння дэпутатаў або па праву наследвання дэпутацкіх месц, дык яны ўвогуле не падпадаюць ні пад адну з форм дэмакратыі. Далей, паскольк сістэма выбарных парламентаў заснавана на агітацыі дзеля атрымання галасоў, яна з'яўляецца ДЭМАГАГЧНАЙ сістэмай у поўным сэнсе гэтага слова, бо галасы можна купляць і падтасоўваць. Бо бедныя не могуць канкурыраваць у перадвыбарчых кампаніях, таму багатыя, толькі багатыя, атрымліваюць верх!

Тэорыя прадстаўнічага кіравання была прапанавана філосафамі, мысліцелямі і літаратарамі ў той час, калі каралі, султаны і заваёўнікі кіравалі народамі, як маўклівым быдлам. Пікам жадання народаў у тыя часы было мець сваіх прадстанікоў, якія гаварылі б ад іх імя з такога роду правіцелямі, Але нават у

гэтым жаданні м адмаўлялі, і народы прайшлі доўгі пакутлівы шлях барацьбы, перш чым ажыццявілі сваю мэту.

Але сёння, у век рэспублік, калі наступае эпоха мас, дэмакратыя, прадстаўленая групай дэпутатаў, што выступаюць ад імя шырокіх мас, стала абсурдам. Гэта - састарэлая тэорыя і ажыўшая сябе практыка. Улада павінна цалкам надлежаць народу.

Самыя жорсткія дыктатуры, якія калі-небудзь ведаў свет, існавалі ва ўмовах парламенцкіх рэжымаў.

ПАРТЫЯ

ПАРТЫЯ

Партыйная сістэма ёсць выхалашчванне дэмакратыі.

Партыя - гэта сучасная дыктатура, гэта сучасная дыктатарская прылада кіравання, паскольк партыя - улада часткі над цэлым. Гэта найноўшая прылада дыктатуры. Паскольк партыя - не адна асоба, то ўяўнасць фармальнай дэмакратыі ствараецца ўтварэннем сходаў дэпутатаў, камітэтаў, а таксама з дапамогай прапаганды, праводзімай яе членамі. Партыя ні ў якім выпадку не з'яўляецца дэмакратычнай прыладай, бо яна ўтвараецца з групы людзей, аб'яднаных альбо агульнымі інтарэсам, агульным светапоглядам, агульнай культурай, агульнай тэрыторыяй, альбо агульнай ідэалогіяй. Гэтыя людзі ствараюць партыю для ажыццяўлення сваіх інтарэсаў ці навязвання грамадству сваіх поглядаў і ўсталявання панавання ў ім сваёй ідэалогіі. Іх мэта - дабіца ўлады пад выглядам ажыццяўлення сваёй праграмы. З пункту гледжання сапраўднай дэмакратыі недапушчальна, каб адна партыя кіравала ўсім народам, паколькі народ - гэта мноства інтарэсаў, паглядаў, характараў, тэрыторый і перакананняў. Партыя - гэта дыктатарская

Партыйная прыналежнасць - ідрада.

прылада кіравання, якая дазваляе прыхільнікам нейкага аднаго пункту гледжання ці асобам, аб'яднаным нейкім адным інтарэсам, кіраваць усім народам. Адносна народа партыя толькі меншасць. Мэта ўтварэння партыі - стварэнне прылады кіравання народам, іншымі словамі, кіраванне тымі, хто стаіць па-за партыяй, пры дапамозе партыі, бо партыя трымаецца на дэспатычным аўтарытарным прынцыпе падпарадкавання народа партыі. Пры гэтым лічыцца, што прыход да ўлады ёсць сродак ажыццяўленна яе мэт, якія - як мяркуецца - супадаюць з мэтамі народа. Гэта тэорыя, закліканая апраўдаць дыктатуру партыі, з'яўляецца падставай для апраўдання любой дыктатуры. Колькасць партый не змяняе сутнасці справы. Больш таго, чым больш партый, тым больш вострая паміж імі барацьба за ўладу, што зводзіць на нішто ўсе заваёвы народа і падрывае любую праграму, накіраваную на крысць усяго грамадства. Гэтая барацьба, якая зводзіць на нішто заваёвы народа і падрывае гэтыя праграмы, выкарыстоўваецца партыяй суперніцай для апраўдання спроб выбіць глебу з-пад ног правячай партыі, каб заняць як месца. У міжусобнай барацьбе партыі рэдка скарыстоваюць зброю. Яны звычайна прымяняюць асуджэнне і ачарненне дзейнасці

адна адной. Такая барацьба непазбежна закранае вышэйшыя жыццёвыя інтарэсы грамадства. Пры тым частка гэтых інтарэсаў, калі не ўсе, прыносіцца ў ахвяру бойцы за ўладу паміж прыладамі кіравання, паскольк і ўдар па гэтых інтарэсах дае апазіцыйная партыі - або партыям - больш важкія аргументы супраць правячай партыі або кааліцыі партый. Будучы па свайму характару таксама прыладай кіравання, апазіцыйная партыя, каб прыйсці да ўлады, павінна зрынуць прыладу кіравання, якая стаіць на чале ўлады. Каб даказаць некампетэнтнасць апошняй, апазіцыйная партыя стараецца звесці на нішто яе дасягненні і дэзавуіраваць праграму яе дзейнасці, нават калі гэта праграма служыць інтарэсам грамадства. Тым самым інтарэсы грамадства, праграмы грамадскага развіцця прыносяцца ў ахвяру міжпартыйнай барацьбе за ўладу. Таму, нягледзячы на атмасферу палітычнай актыўнасці, ствараемую барацьбой партый ва ўмовах шматпартыйнай сістэмы, гэтая барацьба з аднаго боку, аказвае разбуральнае ўздзеянне на палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя бакі жыцця грамадства, а з ругога - прыводзіць да перамогі новай прылады кіравання, падобнай да ранейшай, іншымі словамі, да падзення адной партыі і перамогі другой, але да паражэння

народа, г. зн. да паражэння дэмакратыі. Акрамя таго, партыі прадажныя і могуць быць падкуплены як знутры, так і звонку.

Па сваёй сутнасці партыя ўзнікае як прадстаўнік інтарэсаў народа. У далейшым кіраўніцтва партыі становіцца прадстаўніком інтарэсаў членаў партыі, а затым партыйны лідэр робіцца прадстаўніком інтарэсаў партыйнага кіраўніцтва. Цалкам зразумела, што гульня ў партыю - гэта ханжаскі фарс, увасоблены ў форме дэмакратыі, але па сутнасці пабудаваны на эгаізме і дэспатызме, трукацтве і палітыканстве. Гэтым пацвярджаецца, што партыйная сістэма ёсць сучасная прылада дыктатуры. Партыйная сістэма з'яляецца адкрытай, непрыкрытай формай дыктатуры. Аднак свет яшчэ не прайшоў гэты этап, і таму справядліва назваць яе дыктатурай сучаснай эпохі.

Парламент, які ствараецца перамогшай партыяй, з'яўляецца парламентам гэтай партыі, а выканаўчая ўлада, утвораная гэтым парламентам, з'яўляецца ўладай гэтай партыі над народам. Улада партыі, якая як мяркуецца, прадстаўляе інтарэсы ўсяго народа, на справе з'яўляецца заклятым ворагам другой часткі гэтага народа, ворагам партыі або некалькіх

партый, што стаяць у апазіцыі, і яе - ці іх - прыхільнікаў у народзе. Апазіцыя не з'яўляецца органам кантролю народа за дзейнасцю правячай партыі, яна толькі чакае падыходзячага моманту, каб заняць яе месца каля стырна ўлады. Законным органам кантролю ў адпаведнасці з палажэннямі сучаснай дэмакратыі з'яўляецца парламент, большасць у якім складаюць члены гэтай партыі. Такім чынам, кантроль знаходзіцца ў руках партыі, якая стаіць на чале ўлады, а ўлада - у руках партыі, якая ажыццяўляе кантроль. Адсюль зразумела, наскольк і ілжывыя, фальшывыя і нежыццяздольныя існуючыя ў сучасным свеце палітычныя тэорыі, на якіх базіруецца дэмакратыя ў яе цяперашнім выглядзе.

"Партыя прадстаўляе частку народа, між тым як суверэнітэт народа недзялімы".

"Партыя кіруе ад імя народа, на справе ж ніякае прадстаўніцтва ад імя народа немагчыма".

Партыя - гэта племя сучаснай эпохі, гэта - клан. Грамадства, якім кіруе аднапартыя, нічым не адрозніваецца ад грамадства, якім кіруе адно племя ці адзін клан, паколькі партыя, якая, як сказана вышэй, прадстаўляе погляды адной часткі народа, інтарэсы аднаго слоя грамадства, адну ідэалогію ці адну тэрыторыю, складае, як племя ці клан, у параўнанні з цэлым народам

меншасць, - яна мае адзіныя інтарэсы або адзіную кланавую ідэалогію. На базе гэтых інтрарэсаў ці гэтай ідэалогіі фарміруецца адзіны светапогляд: усё адрозненне паміж партыяй і племенем заключаецца ў кроўнай роднасці ў апошняга, што, зрэшты, магло мець месца і ў партыі ў перыяд яе зараджэння. Барацьба партыі за ўладу нічым не адрозніваецца ад барацьбы за ўладу паміж плямёнамі і кланамі. І калі палітычная ўлада аднаго племені ці аднаго клана зараз ганьбуецца і адхіляецца, дык немагчыма прыняць і адобрыць і партыйны рэжым, бо ў абодвух выпадках ход падзей ідзе ў адным напрамку і прыводзіць да аднаго і таго ж выніку. Міжплямённая барацьба і барацьба паміж кланамі аказваюць на грамадства такое ж негатыўнае, разбуральнае ўздзеянне, што і міжпартыйная барацьба.

КЛАН

КЛАН

Класавая палітычная сістэма падобна да партыйнай, пляменнай ці кланавай сістэмы. Клас, як і партыя, племя ці клан, падпарадкоўвае сабе грамадства, у якім ён пануе. Клас уяўляе сабой частку грамадства, аб'яднаную агульным інтарэсамі, у аснове якіх ляжаць кроўныя сувязі, агульная ідэалогія, культура, геаграфічная супольнасць, узровень жыцця.

Клас, партыя, клан і племя нараждаюцца адным і тымі ж фактарамі, якія прыводзяць да адных і тых жа вынікаў, г. зн. яны ўзнікаюць, паколькі кроўныя сувязі, агульныя перакананні, узровень жыцця, культура і геаграфічная супольнасць ствараюць і адзінае ўяўленне аб тым, як дасягнуць агульнай мэты. Такая група афармляецца сацыяльна ў выглядзе класа, партыі, племені ці клана, у выніку чаго ствараецца сацыяльная ў сваёй прылада, якая дзейнічае палітычнымі сродкамі ў імя інтарэсаў і перамогі ідэй пэўнай групы.

Ва ўсіх выпадках народ не з'яўляецца ні класам, ні партыяй, ні племенем, ні кланам, якія ўяўляюць сабой толькі частку народа, складаючы меншасць. Калі ў грамадстве

сталёваецца панаванне класа, партыі, племені ці клана, то рэжым у гэтым грамадстве будзе дыктатарскім. Разам з тым кааліцыя класаў ці плямёнаў мае перавагу над кааліцыяй партый, паскольк народ у аснове сваёй складаецца з сукупнасці плямёнаў і людзі, якія не належаць ні да якога племені, сустракаюцца рэдка. Усе людзі належаць да пэўных класаў. Што ж датычыць партыі або шэрагу партый, дык зусім не ўвесь народ уваходзіць у іх склад. Адсюль вынікае, што партыя або кааліцыя партый ўяўуляе сабой меншаць у адносінах да шырокіх беспартыйных мас. З пункту гледжання сапраўднай дэмакратыі нельга апраўдаць клас, які падаўляе ў імя сваіх інтарэсаў астатнія класы, як і нельга апраўдаць партыю, якая падаўляе дзеля сваіх інтарэсаў астатнія партыі, - племя, якое падаўляе дзеля сваіх інтарэсаў іншыя плямёны, - клан, які падаўляе ў імя сваіх інтарэсаў астатнія кланы. Дапусціць такое нястрымнае падаўленне іншых - значыць адкінуць прэч логіку дэмакратыі і падпарадкавацца логіцы сілы. Такія дзеянні з'яйляюцца дыктатарскімі, таму што яны не адказваюць інтарэсам грамадства ў цэлым, якое складаецца не толькі з аднаго класа, аднаго племені, аднаго клана ці членаў адной партыі. Такія дзеянні не маюць апраўдання.

Сцвярджэнне, што грамадства складаецца з многіх груп, адна з якіх падаўляе астатнія, каб заставацца аднаасобна на чале ўлады, мае на мэце апраўдаць дыктатуру. Такім чынам, гэтыя дзеянні адказываюць не інтарэсам грамадства ў цэлым, а толькі інтарэсам аднаго класа, племені, клана, партыі, г. зн. інтарэсам тых, хто падмяняе сабой грамадства. Такія дзеянні накіраванны ў асноўным супраць тых членаў грамадства, якія не знаходзяцца ў гэтай партыі, не належаць да гэтага класа, племені, клана, як ажыццяўляе акцыю падаўлення.

Грамадства, раздзіраемае міжпартыйнай барацьбой, падобна да грамадства, раздзіраемага міжплямённай або міжкланавай барацьбой.

Партыя, ствараемая пэўным класам, паступова падмяняе сабой гэты клас і ў далейшым клас, які супрацьстаіць яе асабістаму класу.

Стаўшы пераемнікам грамадства, клас атрымлівае ў спадчыну ўласцівыя яму рысы. Гаворачы іншымі словамі, напрыклад, рабочы клас, які падавіў іншыя класы, становіцца персаніфікатарам усяго грамадства, г. зн. увасабляе яго матэрыяльную і сацыяльную базу. З цягам часу і ў самога рабочага класа пачынаюць праяўляцца, хоць і не адразу, рысы, уласцівыя падаўленым ім класам, і сам ён потым пераходзіць на пазіцыі, тыповыя для іх, пасколькі

пераемнік, як правіла, пераймае рысы таго, ад каго ён атрымлівае іх у спадчыну. Так, рабочы клас з цягам часу сам ператвараецца ў грамадства, якому ўласцівы супярэчнасці грамадства, якое папярэднічала яму. Спачатку з'яўляюцца адрозненні ў матэрыяльным і духоўным узроўні асобных членаў грамадства, затым утвараюцца грамадскія слаі, якія спантанна фарміруюцца ў класы, - тыя ж самыя класы, што былі раней падаўлены. Барацьба за ўладу над грамадствам начынаецца зноў: кожная асобная група людзей, затым грамадскі слой і, нарэшце, новый клас сапрабуюць узяць уладу ў свае рукі.

Матэрыяльная база грамадства нестабільная, таму што яна па сваёй прыродзе таксама сацыяльная. Прылада кіравання, якая абапіраецца на адзіную па свайму характару матэрыяльную базу грамадства, відаць, можа на працягу нейкага часу быць стабільным, але як толькі ў гэтай адзінай матэрыальнай базе нараждаюцца новыя матэрыяльныя і сацыяльныя з'явы стабільнасць страчваетцца.

Любое грамадства, у якім працякае барацьба класаў, у мінулым было грамадствам аднаго класа, які нарадзіў у выніку непазбежнага закону развіцця процiборствуючыя паміж сабой класы. Клас, які адчувае ўласнаць іншага класа і

авалодвае ёю каб утрымаць уладу ў сваіх руках, паказвае, што гэтая ўласнасць аказвае на яго такое ж уздзеянне, якое яна раней аказвала на грамадства ў цэлым.

Карацей кажучы, спробы уніфікаваць матэрыяльную базу грамадства для вырашэння праблемы кіравання дзяржавай або для таго, каб вырашыць барацьбу на карысць адной партыі, аднаго класа, клана, племені, пацярпелі няўдачу, як і спробы задаволіць інтарэсы мас шляхам выбрання іх прадстанікоў ці высвятлення іх місіі пры дапамозе рэферэндуму, і паўтарэнне такіх спроб - пустая трата чалавечага часу і насмешка над народамі.

РЭФЕРЭНДУМ

РЭФЕРЭНДУМ

Рэферэндум - фальсіфікацыя дэмакратыі. Тыя, хто гавораць "так", і тыя, хто гаворыць "не" на справе не выражаюць сваёй волі, а асуджаны сучаснай дэмакратыяй на маўчанне. Яны могуць сказаць толькі адно слова - "так" ці "не". Гэта найбольш жорсткая і бязлітасная форма дыктатарскага рэжыму. Той, хто гаворыць "не", павінен мець магчымасць матываваць, чаму ён сказа "не", а не "так", а той, хто сказа "так" павінен мець магчымасць растлумачыць, чаму ён сказа "так", а не "не". Кожны павінен абгрунтаваць сваё жаданне, прычыну адабрэння ці неадабрэння!

Такім чынам, якім жа шляхам павінны ісці людзі, каб назаўсёды пакончыць з эпохай тыраніі дыктатуры?

Паколькі найбольш складаным пытаннем ва ўсёй праблеме дэмакратыі з'яўляецца пытанне аб прыладзе кіравання, што знаходзіць

адлюстраванне ў барацьбе партый, класаў і асобных людзей, і паколькі такія сродкі, як выбары і рэфэрендум, былі прыдуаны для таго, каб завуаліраваць неабгрунтаванасць няўдалых намаганняў вырашыць праблему дэмакратыі, рашэнне зводзіцца да таго, каб стварыць новую прыладу кіравання, якая не нараджае канфліктаў і не прадстаўляе толькі адну частку грамадства. Іншымі словам, трэба стварыць такую прыладу кіравання, якая б не была ні партыяй, ні класам, ні кланам, ні племенем і ўяўляла б сабой увесь народ у цэлым, а не "прадстаўніцтва" ад яго імя. НІЯКАГА ПРАДСТАЎНІЦТВА АД ІМЯ НАРОДА, ПРАДСТАЎНІЦТВА - ГЭТА ПАДМАН. Калі б удалося стварыць такую прыладу кіравання, дык праблема была б рэальнасцю і чалавецтва назаўсёды пакончыла б з эпохай тыраніі і дыктатуры, на змену ім прыйшла б улада народа.

Зялёная Кніга прапануе канчатковае вырашэнне праблемы прылады кіравання і ўказвае народам шлях пераходу ад эпохі дыктатуры да эпохі сапраўднай дэмакратыі.

У аснове новай тэорыі ляжыць улада народа без усялякіх форм прадстаўніцтва. У адрозненне ад старажытнай, несур'ёзнай спробы ажыццяўлення прамой дэмакратыі, якая не магла быць рэальна ажыццёўлена, паколькі не

існавала масавых народных арганізацый, новая тэорыя рэалізуе прамую дэмакратыю планамерна і эфектыўна.

НАРОДНЫЯ КАНГРЭСЫ І НАРОДНЫЯ КАМІТЭТЫ

Народныя кангрэсы і народныя камітэты

Без народных кангрэсаў няма дэмакратыі.

Адзіным сродкам ажыццяўлення народнай дэмакратыі з'яляюцца народныя кангрэсы.

Усякія іншыя сістэмы кіравання недэмакратычныя. Усе існуючыя сёння ў свеце сістэмы кіравання недэмакратычныя, кал яны не прытрымліваюцца гэтага метаду кіравання.

Народныя кангрэсы з'яляюцца канчатковай мэтай руху народна на шляху да дэмакратыі.

Народныя кангрэсы і народныя камітэты яляюць сабой канчатковы вынік барацьбы народаў за дэмакратыю.

Народныя кангрэсы і народныя камітэты не плод фантазіі, а вынік развіцця чалавечай думкі, які ўвабраў у сябе ўвесь вопыт чалавецтва ў барацьбе за дасягненне дэмакратыі.

Прамая дэмакратыя - гэта ідэальнае рашэнне, якое, будучы ўвасоблена на практыцы, не можа з'яўляцца прадметам спрэчкі і рознагалосся. Аднак паколькі ўвесь народ, якой бы ні была яго колькасць, не можа збірацца разам, каб абмяркоўваць, вывучаць і вызначаць палітычныя пытанні, пароды адышлі ад прынцыпу прамой дэмакратыі, які застаўся чыстай утопіяй, далёкай ад рэальнага жыцця. Узамен з'явілся шматлікія

тэорыі аб прыладах кіравання, такіх як сходы дэпутатаў, кааліцыі партый, рэфэрендумы, якія адхілілі народ ад удзелу ў палітычнай дзейнасці, пазбавілі яго суверэнітэту, а яго ўладу перадалі ў рукі прылад кіравання, што змяняюць адна другую і пастаянна спрачаюцца, пачынаючы ад асобных людзей і канчаючы класамі, кланамі, плямёнамі, парламентамі ці партыямі. Зялёная Кніга ў выдатнай, канкрэтнай форме ўказвае народам шлях да прамой дэмакратыі. Паколькі прамая дэмакратыя, хаця і не магла быць рэалізавана раней, бясспрэчна, яна - ідэальны метад кіравання, і паколькі Трэцця Сусветная Тэорыя прапануе рэалістычны падыход да вырашэння пытання прамой дэмакратыі, дык тым самым і праблема дэмакратыі ў свеце можа быць вырашана канчаткова. Масы павінны змагацца за знішчэнне ўсіх аўтарытарных форм кіравання, называемых рознымі формамі дэмакратыі, - ці то кіраванне парламентаў, плямёнаў, кланаў, класаў, ці кіраванне адной, дзвюх або некалькіх партый.

Камітэты павінны існаваць пасюдна.

Да дэмакратыі ляжыць толькі адзін шлях, яна мае толькі адну тэорыю. Разнастайнасць і непадабенства рэжымаў, называемых дэмакратычнымі, толькі пацвярджае іх недэмакратычнасць. Улада народа знаходзіць адлюстраванне толькі ў адной форме, і

ажыццяўленне ўлады народа магчыма толькі адным шляхам - шляхам стварэння народных кангрэсаў і народных камтэтаў. Без народных кангрэсаў няма дэмакратыі, камтэты павінны існаваць паўсюдна.

Спачатку ўсё насельніцтва разбіваецца на пярвічныя, нізавыя народныя кангрэсы. Кожны кангрэс выбірае ў якасці кіруючага органа камітэт. Камітэты фарміруюць народныя кангрэсы на ўзроўні акруг, г. зн. ужо не пярвічныя. Далей, масы аб'яднаныя ў пярвічныя народныя кангрэсы, выбіраюць адміністрацыйныя народныя камітэты, якія замяняюць сабой дзяржаўную адміністрацыю і бяруць на сябе кіраванне ўсімі галінамі гаспадаркі грамадства. Народныя камітэты, якія кіруюць галінамі грамадскай гаспадаркі, адказныя перад пярвічнымі народнымі кангрэсамі, што вызначаюць іх палітыку і кантралююць выкананне. Тым самым кіраванне становіцца народным, народным становіцца кантроль, губляецца аджыўшае вызначэнне дэмакратыі, якое абвяшчае, што дэмакратыя - гэта КАНТРОЛЬ НАРОДА НАД УРАДАМ, і на яго месца ставіцца правільнае вызначэнне, што абвяшчае: ДЭМАКРАТЫЯ - ГЭТА НАРОДНЫ САМАКАНТРОЛЬ.


Дэмакратыя - гэта народны самакантроль.

Усе грамадзяне, якія з'яўляюцца членамі

народных кангрэсаў, па роду сваіх заняткаў належаць да розных груп і слаёў грамадства. Таму побач з членствам ці ўдзелам у кіраўніцтве пярвічнымі народнымі кангрэсамі або народнымі камітэтамі яны павінны стварыць свае народныя прафесіянальныя кангрэсы.

Пытанні, якія абмяркоўваюцца народнымі кангрэсамі і народнымі камітэтамі, канчаткова фармулююцца на Усеагульным народным кангрэсе, дзе сумесна збіраюцца кіруючыя органы народных кангрэсаў, народных камітэтаў. Вынікі работ Усеагульнага народнага кангрэсу, які праводзіцца раз у год, перадаюцца у сваю чаргу, народным кангрэсам, народным камітэтам для выканання народнымі камітэтамі, падсправаздачнымі пярвічным народным кангрэсам. Усеагульны народны кангрэс не з'яўляецца форумам асобных членаў, як гэта мае месца ў парламентах, а з'яўляецца форумам народных кангрэсаў і народных камітэтаў.

Так натуральна вырашаецца праблема прылады кіравання і кладзецца канец існаванню дыктатарскіх форм кіравання. Прыладай кіравання становіцца народ. Канчаткова і назаўсёды вырашаецца праблема дэмакратыі ў свеце.


Народны камітэт
Асноўны народны кангрэс
Народны камітэт
Народны кангрэс муніцыпалітэта
Асноўны народны кангрэс
Народны камітэт
Народны кангрэс муніцыпалітэта
Асноўны народны кангрэс
Народны камітэт
Усеагульны народны кангрэс
Усеагульны народны кангрэс
Прафесійныя народныя кангрэсы
Народны камітэт
Сакратарыят Усеагульнага народнага кангрэса
Усеагульны народны камітэт
Сакратарыят кангрэса
Народны камітэт розных выканаўчых сектараў (сельская гаспадарка, адукацыя, аховa здароўя, жыллёвае будаўніцтва і г.д.)

ЗАКОН ГРАМАДСТВА

ЗАКОН ГРАМАДСТВА

Акрамя праблемы прылады кіравання існуе яшчэ адна праблема, якая, хоць і выракалася ў асобныя перыяды гісторыі, у сучасным свеце вырашэння не знайшла. Гэта праблема Закону. Неправамерна і недэмакратычна даручаць выпрацоўку Закону грамадства камітэту ці парламенту. Таксама ж неправамерна і недэмакратычна дапусціць, каб Закон грамадства змяняўся асобнымі людзьмі, камітэтамі ці парламентам.

Такім чынам, што такое Закон грамадства? Хто яго выпрацоўвае? Якое яго значэнне для дэмакратыі?

Сапраўдным Законам грамадства з'яўляецца альбо звычай, альбо рэлігія. Усялякая спроба ўстановіць Закон грамадства, абыходзячы гэтыя зыходныя адпраўныя моманты, неправамерная і нелагічная. Канстытуцыя не з'яўляецца Законам грамадства. Канстытуцыя - гэта асноўны, устаноўлены чалавекам закон. Гэты

закон павінен мець крыніцу, якая апраўдвала б яго існаванне. Праблема свабоды ў сучасным грамадстве народжана тым, што Законам грамадства сталі канстытуцыі, якія абапіраюцца выключна на светапогляд пануючых у свеце дыктатарскіх прылад кіравання, пачынаючы ад асобы і канчаючы партыяй. Гэта пацвярджаецца разыходжаннямі ў канстытуцыях, хоць свабода чалавека адзіная. Прычынай гэтых разыходжання з'яўляецца розніца ў светапоглядах тых, хто стаіць на чале ўлады. Менавіта тлумачэнне свабоды з'яўляецца слабым месцам існуючых зараз у свеце рэжымаў. Метад, з дапамогай якога прылады кіравання імкнуцца ўстанавіць сваё панаванне над народамі, вызначаецца канстытуцыяй, і людзі вымушаны яму падпарадковацца ў сілу законаў, народжаных канстытуцыяй, якая сама з'яўляецца плодам настрояў і перакананняў прылады кіравання.

Закон дыктатарскіх прылад кіравання падмяніў сабой натуральны закон. Паколькі закон, створаны чалавекам, замяніў натуральны закон, крытэрыі змясціліся.

Чалавек застаецца чалавекам усюды і па свайму фізічнаму абліччу, і па сваіх эмоцыях. Таму натуральны закон з'яўляўся лагічным законам для чалавека, адзінага ў сваёй чалавечай

сутнасці. Затым канстытуцыі, будучы законамі, створанымі чалавекам, перасталі разглядаць яго як адзіную пастаянную ў сваёй чалавечай прыродзе істоту. Адзіным апраўданнем такой пазіцыі з'яўляецца імкненне прылад улады, ці то будзе асоба, парламент, клас або партыя, уладарыць над народамі.

Відавочна таму, калі мяняецца прылада ўлады, звычайна мяняюцца і канстытуцы. Гэта гаворыць аб тым, што канстытуцыя зусім не натуральны закон, а валюнтарысцкае параджэнне прылады кіравання, закліканае служыць яго інтарэсам.

Пагроза свабодзе тоіцца ў страце чалавечым грамадствам свайго сапраўднага Закону і падмене яго законам, створаным чалавекам, каб прылады кіравання маглі кіраваць масамі. На самой справе неабходна прывесці ў адпаведнасць з Законам грамадства метад кіравання, а не наадварот.

Такім чынам, Закон грамадства не мае патрэбы ў складанні ці выпрацоўцы. Значэнне Закону заключаецца ў тым, што толькі ён можа вызначыць, што ісціна, а што падман, што правільна, а што не, і якія правы і абавязкі членаў грамадства. Свабода знаходзіцца пад пагрозай, калі грамадства не мае свяшчэннага Закону, у аснове якога ляжаць непахісныя

нормы, што не падлягаюць змянению ці выпраўленню на волі прылад кіравання. Больш таго, прылада кіравання сама абавязана заховаць па волі прылад кравання. Больш таго, прылада кравання сама абавязана захоўваць Закон грамадства. Аднак сёння паўсюль у свеце народы кіруюцца законамі, створанымі чалавекам, змяняемымі і ліквідуемымі ў залежнасці ад таго, якая прылада кіравання пераможа ў барацьбе за ўладу. Агульнанародныя рэферэндумы па пытанню аб канстытуцыях не заўсёды з'яўляюцца эфектыўным сродкам, паколькі яны, мяркуючы аднаскладаны адказ - "так" ці "не", фальсіфікуюць дэмакратыю. Акрамя таго, народы прымушаюцца да ўдзелу ў рэферэндумах законамі, створанымі чалавекам. Правядзенне рэферэндуму па пытанню аб канстытуцыі не азначае, што канстытуцыя - гэта прадмет, па якому праводзіцца рэферэндум, і не больш за гэта.

Закон грамадства - адвечна спадчына, а не здабытак толькі тых, хто жыве сёння. Таму распрацоўка канстытуцыі і вынясенне яе на рэферэндум сярод сучаснікаў - гэта свайго роду фарс.

Зводы законаў, створаныя людзмі, на аснове створаных людзьмі ж канстытуцый, прадугледжваюць мноства мер пакарання, чаго

амаль не ведае звычай, які накладвае маральныя, а не матэрыяльныя меры пакарання, якія не прыніжаюць годнасці чалавека. Рэлігія засвойвае і ўключае ў сябе звычай. Большасць матэрыяльных мер пакарання ў рэлігіі адкладваюцца да Суднага дня, а большая частка прадпісанняў падаецца ў выглядзе пропаведзяў, настаўленняў і адказаў на пытанні. Гэта найбольш адпавядаючы чалавечай годнасці закон. Рэлігія прадугледжвае неадкладнае пакаранне толькі ў крайніх выпадках, калі гэта неабходна для абароны грамадства.

Рэлігія ўключае ў сябе звычай, а звычай ёсць выражэнне натуральнага жыцця народаў. Такім чынам, рэлігія, якая ўключае звычай, ёсць сцвярджэнне натуральнага закону. Законы, якія не базіруюцца на рэлігіі звычаі, спецыяльна ствараюцца чалавекам супраць чалавека і таму неправамерныя, паколькі яны не грунтуюцца на натуральнай крыніцы - звычаі і рэлігіі.

Хто назірае за ходам жыцця грамадства?

Узнікае пытанне: хто назірае за тым, каб своечасова папярэдзіць адхіленне грамадства ад Закону? З пункту гледжання дэмакратыі ніякая група людзей неправамоцная ажыццяўляць

нагляд за грамадствам. ГРАМАДСТВА САМО АЖЖЫЦЯЎЛЯЕ КАНТРОЛЬ НАД САБОЙ. Любыя прэтэнзіі з любога боку, ці то гэта будзе асобны чалавек ці група людзей, прысвоіць сабе права на кантроль за захаваннем Закону - ёсць дыктатура, паколькі дэмакратыя азначае адказнасць усяго грамадства, і, такім чынам, кантроль павінен ажыццяўляцца ўсім грамадствам. Гэта і ёсць дэмакратыя, якая ўвасабляецца ў жыццё дэмакратычнай прыладай кіравання, створанай у адпаведнасці з характарам арганізацыі самога грамадства, ці то гэта будуць пярвічныя народныя кангрэсы або народаўладдзе, ажыццяўляемае народнымі камтэтамі і, нарэшце. Усеагульны народны кангрэс (нацыянальны кнангрэс), які аб'ядноўвае сакратарыяты народных кангрэсаў і народных камітэтаў. Адпаведна гэтай тэорыі прыладай кіравання з'яўляецца народ і, такім чынам, народ кантралюе сам сябе. Так ажыццяўляецца самакантроль грамадства за выкананнем свайго Закону.

Як грамадства выпраўляе становішча ў выпадку адхілення ад закону?

Калі прылада кіравання з'яўляецца дыктатарскай, што ўласціва ўсім існуючым палітычным рэжымам, то ў грамадства застаецца толькі адзін шлях для ўхілення парушэння Закону - насілле, што азначае рэвалюцыю супраць існуючай прылады кіравання. Аднак насілле рэвалюцыя, нават калі яны перадаюць пачуцці грамадства, што пратэстуе супраць адыходу ад Закону, ажыццяўляецца не ўсім грамадствам, а толькі тымі, хто праявіць ініцыятыву і смеласць перадаць волю грамадства. Але такі падыход адкрывае шлях дыктатуры, паколькі падобная рэвалюцыйная ініцыятыва прыводзіць да ўлады ў сілу рэвалюцыйнай неабходнасці іншую прыладу кіравання, якая падмяняе сабой народ. Гэта азначае, што прылада кіравання на ранейшаму застаецца дыктатарскай. Акрамя таго, змяненне сітуацыі, якая складалася, з дапамогай сілы з'яўляецца акцыяй недэмакратычнай, хоць яна і здзяйсняецца як вынік дэмакратычнай абстаноўкі, што складалася раней. Грамадства, якое да гэтага часу паварочваецца ў гэтым замкнутым коле, з'яўляецца адсталым. Дзе ж тады выйсце?

Выйсце ў тым, што сам народ, пачынаючы ад пярвічных народных кангрэсаў і канчаючы

Усеагульным народным кангрэсам, павінен стаць прыладай кіравання. Выйсце ў тым, што ўнікае дзяржаўная адміністрацыя і на змену ёй прыходзяць народныя камітэты. Выйсце ў тым, што Усеагульны народны кангрэс становіцца кангрэсам агульнанацыянальным, які аб'ядноўвае разам народныя кангрэсы і народныя камітэты. І калі ва ўмовах такой сістэмы адбываецца адступленне ад Закону грамадства, гэта азначае, што адступленне носіць татальны характар і павінна карэкціравацца з дапамогай шырокай дэмакратычнай перабудовы, а не праз прымяненне сілы. Гэтая аперацыя не зводзіцца да валюнтарысцкага выбару метаду змянення ці выпраўлення. Яна непазбежна вынікае з самой прыроды дэмакратычнага грамадства, паколькі ў такой сітуацыі не існуе органаў, што стаяць над грамадствам, супраць якіх маглі б быць накіраваны гэтыя гвалтоўныя дзеянні і якія магла б быць ускладзена адказнасць за адступленне ад Закону.

ПРЭСА

ПРЭСА

Чалавек, як фізічная асоба, павінен мець свабоду самавыражэння і, нават будучы пазбаўленым розуму, мець права свабодна выражаць сваё вар'яцтва.

Чалавек, як юрыдычная асоба, таксама свабодны ў выражэнні сябе. У першым выпадку чалавек прадстаўляе толькі самога сябе, у другім - толькі групу фізічных асоб, якія ўтвараюць юрыдычную асобу.

Грамадства складаецца з мноства фізічных юрыдычных асоб. Таму, калі фізічная асоба з'яўляецца вар'ятам, гэта не азначае, што астатнія члены грамадства таксама пазбаўлены розуму. Фізічная асоба выражае толькі сябе, юрыдычная асоба - інтарэс ці думку групы асоб, што ўтвараюць юрыдычную асобу. Кампанія, якая вырабляе ці прадае тытунь, выражае інтарэсы толькі тых, хто яе заснаваў, г. зн., асоб,

Дэмакратыя - гэта праўленне народа, а не народнае самавыражэнне.

зацікаўленых у вырабе ці продажы тытуню, хоць ён шкодны для здароўя людзей.

Прэса - гэта спосаб самавыражэння грамадства, а не нейкай адной фізічнай або юрыдычнай асобы. Таму з пункту гледжання як логікі, так і дэмакраты прэса не можа належаць ні фізічнай, ні юрыдычнай асобе.

Газета, якая з'яўляецца ўласнасцю індывідуума, выказвае толькі пункт гледжання яе ўладальніка. Сцвярджэнне, што яна прадстаўляе грамадскую думку, беспадстаўнае, бо на справе яна выражае пункт гледжання фізічнай асобы, а з пункту гледжання сапраўднай дэмакратыі недапушчальна, каб адна асоба валодала публічнымі сродкамі друку і інформацыі. Аднак ёй належыць натуральнае права самавыражэння любым спосабам, нават самым вар'яцкім, у выпадку, калі чалавек з'яўляецца пазбаўленым розуму. Газета, якую выдае, напрыклад, прафсаюз гандляроў ці гандлёвая палата, з'яўляецца сродкам выражэння інтарэсаў і поглядаў толькі гэтай грамадскай групы, прадсталяе тольк яе пункт гледжання, а не пункт гледжання ўсяго грамадства.

Тое ж самае з астатнімі фізічным і юрыдычнымі асобамі ў грамадстве. Дэмакратычны друк - гэта друк, выдаваемы народным камітэтам, які ўключае разнастайныя грамадскія групы. Толькі

ў гэтым выпадку друк і іншыя сродкі інфармацыі будуць выражаць думку грамадства ў цэлым, з'явяцца рупурам грамадскай думкі. Тым самым друк і сродкі інфармацыі стануць сапраўды дэмакратычнымі.

Калі прафсаюз урачоў выдае газету, яна, каб сапраўды прадстаўляць арганізацыю якая яе выдае, павінна быць чыста медыцынскай газетай. Тое ж тычыцца і іншых аб'яднанняў. Фізічная асоба мае права выражаць толькі саму сябе. З пункту гледжання сапраўднай дэмакратыі яна не мае права выступаць акрамя як ад сябе. Тым самым рэалізуецца радыкальнае, дэмакратычнае вырашэнне так званай "праблемы свабоды друку". Дыскутуемая сёння ва ўсім свеце праблема друку з'яўляецца ў цэлым параджэннем нявырашанасці праблемы дэмакратыі. Вырашыць яе магчыма толькі пераадолеўшы крызіс дэмакратыі ў грамадстве ў цэлым. Адзіным сродкам вырашэння гэтай складанай праблемы, г. зн. праблемы дэмакратыі, з'яўляецца толькі Трэцця Сусветная Тэорыя.

* * *

Гэтая тэорыя сцвярджае, што дэмакратычная сістэма ўяўляе сабой трывалую і маналітную структуру, кожная ячэйка якой мае надзейную апору ў выглядзе

пярвічных народных кангрэсаў, народных кангрэсаў і народных камітэтаў, якія сустракаюцца на пасяджэнні Усеагульнага народнага кангрэсу.

Ніякай ншай канцэпцыі сапраўды дэмакратычнага грамадства існаваць не можа.

Такім чынам, эноха мас, якая энергічна ідзе на змену эпосе рэспублік, уражвае і натхняе. Аднак у той жа ступені, у якой гэта эпоха нрадказвае сапраўдную свабоду мас і ноўнае вызваленне ад путаў прылад кіравання, яна папярэджвае аб наступленні эпохі анархіі дэмагогіі, калі новая дэмакратыя, якая ўяўляе сабой уладу народа, зно ператворыцца ва ўладу асобы, класа, племені, клана ці партыі.

Такая сапраўдная дэмакратыя з тэарэтычнага пункту гледжання. У сапраўднасці ж заўсёды кіруюць моцныя, г. зн. найбольш моцная астка грамадства.

Муамар КАДДАФІ

ЗЯЛЁНАЯ КНІГА

Частка друга

ВЫРАШЭННЕ ЭКАНАМЧНАЙ ПРАБЛЕМЫ
(Сацыялізм)

Эканамічны аспект трэцяй сусветнай тэорыі

Нягледзячы на тое, што на шляху вырашэння праблемы працы і аплаты працы мелі месца гістарычна важныя перамены, якія праўяляліся у прыватнасці, у змяненні адносін паміж рабочымі і работадаўцамі, паміж гаспадарамі і вытворцамі, у тым ліку абмежаванне працягласці рабочага дня, аплата звышурочнай працы, розныя адпачынкі, устанаўленне мінімуму зарплаты, удзел рабочых у прыбытках і кіраванні, забарона самастойных звальненняў, сацыяльнае забеспячэнне, права на забастоўкі і іншыя ўстанаўленні, якія згадваюцца ў законах аб працы, што сталі састаўной часткай любога сучаснага заканадаўства, а таксама не менш важныя змяненні ў сферы адносін уласнасці, а менавіта, прыняцце рашэнняў, якія абмяжоўваюць даход, і ўвядзенне законаў, якія забараняюць прыватную ўласнасць і перадаюсць яе ў рукі дзяржавы - нягледзячы на ўсе гэтыя перамены, значэнне якіх у гісторыі

эканамічнай праблемы нельга скідваць з рахунку, эканамічная праблема ўсё яшчэ чакае радыкальнага вырашэння. Хоць сёння, у параўнанні з ранейшымі часамі, у выніку прынятых мер па паляпшэнні становішча работнікаў гэта праблема менш вострая, разам з тым вырашэнне яе, у цэлым, у сучасным свеце не знойдзена. Намаганні вырашыць яе ў сферы адносін уласнасці не вырашылі праблемы вытворцаў, якія па-ранейшаму застаюцца наёмнымі работнікамі нягледзячы на тое, што самая кансерватыныя формы ўласнасці змяніліся самымі прагрэсіўнымі формамі пры ўзнаўленні прамежкавых форм.

Не меншыя намаганні прыкладаліся ў адносінах да заработнай платы. У выніку, у сферы аплаты працы працоўныя дабіліся шэрагу пераваг, замацаваных заканадаўствам і ахоўваемых прафсаюзамі. Цяжкае становішча, у якім знаходзіліся вытворцы напярэдадні прамысловай рэвалюцыі, змянілася да лепшага. Рабочыя, тэхнічныя спецыялісты адміністрацыйныя служачыя дабіліся з цягам часу правоў, якія здаваліся раней недасягальнымі. І тым не менш эканамчная праблема прадаўжае снаваць.

Меры, якія прадпрымаліся ў галіне заработнай платы, ні ў якім выпадку не вырашылі

праблемы. Яны ўяўлялі сабой хутчэй толькі крывадушную рэфармісцкую спробу аказаць дабро, чым сапраўднае прызнанне правоў працоўных. Чаму працоўныя атрымліваюць заработную плату? Да тыму, што яны ажыццяўляюць вытворчы працэс у інтарэсах іншых, - тых, хто іх наняў для вырабу прадукцыі. Такім чынам, яны не спажываюць выраблены імі прадукт, а вымушаны ўступаць яго ў абмен на заработную плату. Правільным з'яўляецца прынцып: "Хто вырабляе, той спажывае".

Наёмныя работнікі, які б вялікі ні быў іх заробак, - гэта тыя ж рабы.
Наёмны работнік знаходзіцца ў напаўрабскай залежнасці ад наняўшага яго гаспадара. Больш таго, ён часовы раб і ў аснове яго рабства - праца, за якую ён атрымлівае плату ад работаўдаца, незалежна ад таго, з'яўляецца работадаўцам прыватная асоба ці дзяржава.

Нягледзячы на адрозненне форм уласнасці, пачынаючы ад кансерватыўных і канчыючы прагрэсіўнымі работнікі ў сваіх адносінах з уласнікамі ці вытворчымі прадпрыествамі, з пункту гледжання сваіх уласных інтарэсаў, застаюцца наёмнікамі пры ўсіх сённяшніх існуючых формах уласнасці.

Нават прадпрыемствы дзяржаўнага сектара плоцяць сваім работнікам заработную плату і прадастаўляюць ім разнастайныя сацыяльныя даброты, падобныя да тых падачак, якімі ўдастойваюць сваіх работнікаў багацеі, уладальнікі прыватных вытворчых прадпрыемстваў.

Меркаванне, што даход ва ўмовах дзяржаўнай уласнасці ідзе грамадству, у тым ліку самім работнікам, тады як даход прыватных прадпрыемстваў паступае толькі ўладальніку прадпрыемства, справядлівае, калі прымаць пад увагу інтарэсы грамадства ў цэлым, а не ўласныя інтарэсы работнікаў. Калі дапусціць, што палітычная ўлада, якая манапалізуе ўласнасць, з'яўляецца ўладай агульнанароднай, г. зн. уладай усяго народа, якую ён ажыццяўляе праз народныя кангрэсы, народныя камітэты, а не ўладай аднаго класа, адной партыі ці блока партый, уладай аднаго клана, племені, сямейства, асобы ці адной з форм дэпутатскага прадстаўніцтва, дык і тады атрымліваемая работнікамі для задавальнення ўласных патрэб заработная плата, доля прыбытка ці сацыяльныя паслугі, па сутнасці, нічым не адрозніваецца ад таго, што атрымліваюць работнікі прадпрыемстваў прыватнага сектара: і тыя, і

другія працуюць за зароботную плату, незалежна ад таго, хто з'яўляецца іх гаспадаром. Такім чынам, тыя змяненні, у выніку якіх уласнасць пераходзіла з рук у рукі, не вырашалі пытання аб праве работніка на вырабляемы непасрэдна ім прадукт - ні праз грамадства, ні ў выглядзе заработнай платы, паскольк вытворцы, нягледзячы на змяненне форм уласнасці, па-ранейшаму застаюцца наёмнікамі. Канчатковае вырашэнне праблемы заключаецца ў адмене заработнай платы і вызваленні чалавека ад яго путаў, вяртанне да натуральных правілаў, якія вызначалі гэтыя адносіны да з'яўлення класаў, розных форм кіравання і заканадаўства, створанага чалавекам.

Натуральныя правіла з'яўляюцца адзіным крытэрыем, крыніцай і зыходным пунктам чалавечых адносін.

Натуральныя правілы, якія ляжаць у аснове натуральнага сацыялізму, заснаванага на роўнасці элементаў эканамічнай вытворчасці, абумовілі прыблізна роўнае спажыванне прадуктаў прыроды людзьмі. Эксплуатацыя чалавека чалавекам, імкненне чалавека прысвоіць сабе больш, чым яму неабходна, з'яўляюцца адыходам ад натуральных правілаў, пачаткам дэградацыі і адступлення ад здаровых форм жыцця чалавечага грамадства і пачаткам

яраджэння эксплуататарскага грамадства. Аналіз існаваўшых на працягу гісторыі чалавецтва фактараў эканамічнай вытворчасці заўсёды ўстанаўлівае, што асноўнымі элементамі вытворчасці заўсёды ўсюды былі прадметы працы, прылады вытворчасці і вытворца. Натуральнае правіла роўнасці гаворыць: кожны элемент вытворчасці ўносіць сваю долю ў вытворчы працэс, і выключэнне аднаго з іх робіць вытворчасць немагчымай; кожнаму элементу вытворчасці належыць асноўная роля, і без яго вытворчасць спыняецца. Паскольк кожны са згаданых элементаў неабходны і абавязковы, г. зн. усе яны раўназначныя элементы вытворчага працэсу, то кожны з іх мае роўнае права выпрабляемы прадукт, і первага аднаго з іх другому супярэчыць натуральнаму правілу роўнасці і з'яўляецца замахам на правы другога. Такім чынам, кожнаму элементу, незалежна ад іх агульнай колькасці, належыць свая доля. Калі вытворчы працэс ажыццяўляецца толькі двума элементамі, дык кожны атрымлівае палову выпрабляемага прадукта, калі гэтых элементаў тры - кожнаму прыпадае трэць і г. д.

Прымяненне гэтага натуральнага правіла да даўняга мінулага сённяшняй рэчаіснасці выяўляе наступнае.

У перыяд панавання ручной працы ў працэсе вытворчасці ўдзельнічалі сыравіна і чалавек-вытворца. Пазней пасрэднікамі паміж імі сталі прылады вытворчасці, якія скарыстоўваюцца чалавекам у вытворчых аперацыях.

Спачатку гэта была жывёла, а затым па меры ўдасканалення прылад вытворарчасці на змену жывёле прыйшла машина. Сыравіна таксама перанесла якасныя і колькасныя змяненні: на змену простай і таннай сыравіне прышлі вельмі складаныя і дарагія віды сыравіны. Змяніўся і чалавек, прайшоўшы шлях ад простага рабочага да інжынера і тэхніка, ад велізарнай колькасці некваліфікаваных работнікаў да абмежаванай колькасці тэхнічных спецыялістаў. У той жа час элементы вытворчага працэсу, хоць і прайшлі якасную і колькасную эвалюцыю, з пункту гледжання ролі, якую адыгрывае кожны з іх у працэсе вытворчасці і па ступені сваёй необходнасці, яны па сутнасці справа не змяніліся. Напрыклад, жалезная руда, якая з'яўляецца як у старажытнасці, так і ў нашы дні адным з элементаў вытворчасці, раней перапрацоўвалася прымітыўным спосабам, затым каваль выраблял з жалеза ўручную нож, сякеру, кап'ё і г. д. Цяпер тая ж жалезная руда перапрацоўваецца ў доменных печах, а затым інжынеры і тэхнікі выпрабляюць з атрыманага

металу станкі, рухавікі, транспартныя сродкі. На змену жывёле - каню, мулу, вярблюду і да т. п., якія раней з'яўляліся элементамі вытворчасці, прыйшлі гіганцкія заводы і велізарныя машыны. І калі раней выраблялися прымітыўныя прылады, дык цяпер вырабляецца найскладанейшае тэхнічнае абсталяванне. І сё ж, нягледзячы на капасальныя змяненні, натуральныя фактары вытворчасці засталіся, па сутнасці, ранейшымі. Гэтыя арганічная нязменнасць элементаў вытворчасці пераканаўча даказвае, што натуральнае правіла - гэта тая здаровая аснова, да якой неабходна звярнуцца для канчатковага вырашэння эканамічнай праблемы, бо ўсе ранейшыя спробы, калі мела месца пагарджэнне гэтымі правіламі, пацярпелі няўдачу.

Гістарычныя канцэпцыі мінулага разглядалі эканамічную праблему толькі з пункту гледжання права ўласнасці на адзін элемент вытворчасці, толькі з пункту гледжання заработнай платы і не вырашалі асноўнай праблемы, а менавіта - праблемы самой вытворчасці. (Такім чынам, галоўная асаблівасць існуючых у сучасным свеце эканамічных сістэм - гэта сістэма заработнай платы, якая пазбаўляе работніка ўсякага права на выпрацаваны ім прадукт, незалежна ад таго, ці ажыццяўляецца выраб на карысць грамадства,

ці на карысць прыватнага ўладальніка).

Прамысловае прадпрыемства функцыяніруе дзякуючы наяўнасці прадметаў працы, заводскага абсталявання і рабочых. Вытворчы працэс ажыццяўляецца ў выніку выкарыстання рабочымі заводскага абсталявання для перапрацоўкі пярвічных матэрыялаў. Такім чынам, вырабленая прадукцыя, прызначаная для спажывання, праходзіць вытворчыя аперацыі, якія былі б немагчымыя, калі б не было сыравіны, прадпрыемства і рабочых. Бо калі б не было пярвічных матэрыялаў, прадпрыемству не было б чаго перапрацоўваць, а калі б не было прадпрыемства, не перапрацоўвалася б сыравіна. Калі ж не было б вытворцаў, прадпрыемства не магло б працаваць. Такім чынам, усе тры элементы, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе, роўным чынам неабходныя для ажыццяўлення вытворчага працэсу, і без наяўнасці ўсіх трох элементаў вытворчасць немагчымая. Пры гэтым любы з іх, асобна ўзяты, не ў стане забяспечыць увесь вытворчы працэс, таксама ж як не ў стане забяспечыць яго толькі два элементы з трох. Натуральнае правіла ў гэтым выпадку дапускае роўнасць гэтых трох элементаў у працэсе вытворчасці. Іншым словамі, мяркуецца, што прадукт, вырабляемы дадзеным

прадпрыемствам, дзеліцца на тры долі. Кожнаму элементу вытворчасці належыць свая доля. Такім чынам, важнае значэнне мае як само прадпрыемства, так і спажывец прадукцыі прадпрыемства.

Тое ж тычыцца і сельскагаспадарчай вытворчасці, у якой удзельнічаюць два элементы - чалавек і зямля – і адсутнічае трэці. Тут прасочваецца поўная аналогія з ручной рамеснай вытворчасцю. Прадукцыя ў гэтым выпадку падзяляецца на дзве долі, адпаведна колькасці элементаў, якія ўдзельнічаюць. Калі ж у земляробстве выкарыстоўваюцца машыны і іншыя прылады, то вырабляемы прадукт павінен дзяліцца паміж трыма элементамі, якія ўдзельнічаюць у сельскагаспадарчай вытворчасці (зямля, земляроб і прымяняемы механізм).

На гэтым заснаваны сацыялістычны лад, дзе ўсе вытворчыя працэсы падпарадкаваны гэтаму натуральнаму правілу.

Вытворцы - гэта рабочыя. Мы гаворым "вытворцы", таму што словы "рабочыя" або "працоўныя" больш не адпавядаюць сапраўднасці. Прычына ў тым, што рабочыя - у традыцыйным разуменні гэтага слова - усё больш мяняюцца як якасна, так і колькасна. Колькасць рабочага класа па меры развіцця

навукі і тэхнікі бесперапынна скарачаецца. Выраб, на які спатрэбілася шмат намаганняў некалькіх рабочых, вырабляецца зараз машынай імгненна, прычым эксплуатацыя машыны патрабуе меншай колькасці работнікаў. Гэта - колькаснае змяненне рабоча сілы. Акрамя таго, машынная тэхніка патрабуе не простай мускульнай сілы, а тэхнічных ведаў, што ўяўляе якаснае змяненне рабочай сілы.

Толькі выраляючая сіла з'яўляецца элементам вытворчасці. Працоўныя масы, раней шматлікія і неадукаваныя, у працэсе развіцця грамадства ператвараюцца ў параўнальная абмежаваную групу тэхнікаў, інжынераў і вучоных. У выніку гэтага рабочыя прафсаюзы адмірающь, і, паколькі навуковы прагрэс чалавецтва з'яўляецца незваротным працэсам, на змену ім прыходзяць прафсаюзы інжынера і тэхнікаў. Неадукаванасць асуджана на знікненне самім гэтым працэсам. Простыя рабочыя, перад тварам бесперапыннага навукова-тэхнічнага развіцця - часовая, паступова знікаючая з'ява чалавек у гэтай сваёй новай якасці назаўсёды застанецца асноўным элементам вытворчага працэсу.

Патрэбнасці маркуюць свабоду.

Патрэбнасці. Свабода чалавека няпоўная, калі яго патрэбнасцямі кіруюць іншыя. Імкненне да задавальнення патрэбнасцей

можа весці да заняволення чалавека чалавекам, эксплуатацыя таксама параджаецца патрэбнасцямі. Задавальненне патрэбнасцей - рэальна існуючыя праблема, і, калі не сам чалавек кіруе сваімі патрэбнасцямі, узнікае барацьба.

Жыллё з'яўляецца асноўнай патрэбнасцю асобнага чалавека і сям'і, і таму яно не можа належаць нікому іншаму. Чалавек, які жыве ў чужым доме, за плату ці бясплатна, не можа быць свабодным. Намаганні, якія прыкладаюць дзяржавы для вырашэння жыллёвай праблемы, ні ў самай малой ступені не вырашаюць яе, паколькі яны не накіраваны на радыкальнае і канчатковае вырашэнне пытання, г. зн. на тое, каб кожны чалавек меў уласнае жыллё. Звычайна, як у прыватным, так і ў грамадскім сектары ставілася толькі мэта панізіць, павысіць альбо нарміраваць плату за жыллё. Нельга дапусціць, каб у сацыялістычным грамадстве як-небудзь орган, у тым ліку і само грамадства, поўнаўладна распараджалася патрэбнасцямі чалавека. Ніхто не мае права будаваць жылы будынак, плошча якога перавышала б патрэбнасці чалавека і яго пашчадкаў з тым, каб здаваць лішкі ў арэнду, паколькі гэта закранае патрэбнасці іншых людзей. Будаўніцтва жылых будынка для здачы

Жыллё - уласнасць яго жыхара.

ў арэнду адкрывае шлях для замаху на патрэбнасці іншых людзей. Патрэбнасць жа мяркуе свабоду.

Сродкі існавання - гэта надзённая патрэбнасць чалавека. Паколькі ў сацыялістычным грамадстве няма наёмных работнікаў, а ёсць партнёры, то недапушчальна, каб сродкі існавання чалавека ў сацыялістычным грамадстве выплочваліся ў выглядзе зарплаты, выдаваемай якой-небудзь установай, або былі чыёйсьці міласцінай. Сродкі існавання - гэта не плата за прадукцыю, выпрацаваную чалавекам для кагосьці іншага, а альбо ўласнасць чалавека, якой ён сам распараджаецца для задавальнення сваіх патрэбнасцей, альбо яго доля ў вытворчасці, адным з асноўных элементаў якой ён з'яўляецца.

Сродак перамяшчэння ёсць яшчэ адна надзённая патрэбнасць асобнага чалавека і сям'і. Нельга дапускаць, каб сродак перамяшчэння чалавека належаў камусьці іншаму. У сацыялістычным грамадстве ні асобна ўзяты чалавек, ні ўстанова не маюць права валодаць індывідуальнымі сродкамі перамяшчэння з мэтай здачы іх у арэнду, бо гэта замах на патрэбнасці іншых.

Зямля. Зямля не належыць нікому. Аднак кожны мае права карыстацца зямлёй на працягу

свайго жыцця і жыцця нашчадкаў для задавальнення ўласных патрэбнасцей, працуючы на зямлі, апрацоўваючы яе ці скарыстоўваючы для выпасу жывёлы, наколькі дазваляюць яму ўласныя сілы, не выкарыстоўваючы пры гэтым чужой аплачанай ці бясплатнай працы. Калі дапусціць перадачу зямлі ва ўласнасць, дык валодаць ёю будуць толькі тыя, што жывуць сёння. Зямля - стабільны фактар, тыя ж, хто ёю карыстаецца, з цягам часу мяняюцца, змяняюцца іх заняткі, іх фізічныя сілы і само іх быццё.

Мэта новага сацыялістычнага ладу - стварыць шчаслівае грамадства, шчаслівае ў сілу сваёй свабоды, што ажыццяўляльна толькі пры задавальненні матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей чалавека пры ўмове, што ніхто не будзе перашкаджаць задавальненню гэтых патрэбнасцей і кантраляваць іх.

Задавальненне патрэбнасцей павінна ажыццяўляцца без эксплуатацыі ці закабалення іншых, інакш яно ўвойдзе ў супярэчнасць з мэтамі новага сацыялістычнага грамадства.

Чалавек у новым грамадстве працуе альбо на сябе, каб свае матэрыяльныя патрэбнасці, альбо працуе для сацыялістычнага прадпрыемства, з'яўляюцца партнёрам у вытворчасці, альбо працуе ў сферы грамадскіх паслуг, і тады

грамадства забяспечвае яго матэрыяльныя патрэбнасці.

Эканамічная дзейнасць ва ўмовах новага сацыялістычнага грамадства - гэта прадукцыйная праца дзеля задавальнення матэрыяльных патрэбнасцей, а зусім не праца, якая не стварае ніякіх даброт, альбо праца, якая мае на мэце прыбытак у імя накаплення, якое перавышае патрэбнасці. Апошняе немагчыма ў сілу новых сацыялістычных прынцыпаў.

Правамернай мэтай эканамічнай дзейнасці асобных людзей павінна быць задавальненне толькі іх уласных патрэбнасцей, таму што сусветныя рэсурсы, па крайняй меры ў кожны дадзены перыяд, абмежаваныя багацці кожнага грамадства паасобку. Таму ніхто не мае права займацца эканамічнай дзейнасцю з мэтай прысваення гэтых багацяў у колькасцях, якія перавышаюць уласныя патрэбнасці чалавека, бо лішак, што перавышае патрэбнасці чалавека, належыць па праву іншым. Чалавек мае права рабіць накапленні змяншаць свае патрэбнасці за кошт вырабленага ім прадукта, а не за кошт працы іншых ці патрэбнасцей іншых. Калі дапусціць эканамічную дзейнасць у маштабах, якія перавышаюць задавальненне ўласных патрэбнасцей чалавека, то, атрымаўшы звыш сваіх патрэбнасцей, гэты чалавек тым самым

перашкодзіць іншым задаволіць іх патрэбнасці. Накапленне долі грамадскага багацця ў памеры, які перавышае патрэбнасці аднаго чалавека, з'яўляецца ўжо замахам на патрэбнасці іншага чалавека.

Нястрымнае імкненне прыватнай вытворчасці да накаплення, якое перавышае патрэбнасці, неабмежаванае выкарыстанне працы іншых людзей для задавальнення ўласных патрэбнасцей ці атрымання нечага звыш гэтых патрэбнасцей, г. зн. выкарыстанне аднаго чалавека і стварэнне накапленняў адных за кошт патрэбнасцей другіх - гэта і ёсць эксплуатацыя. Праца за плату з'яўляецца не толькі рабствам, як сказана вышэй, але і працай без стымулаў, бо вытворца ў такім выпадку - наёмны рабочы, а не раўнапраўны партнёр.

Чалавек, які працуе на сябе, несумненна, адносіцца да вытворчасці добрасумленна. Яго добрасумленнасць стымулюецца тым, што ён працуе для самаго сябе, для задавальнення ўласных матэрыяльных патрэбнасцей. Той, хто працуе на сацыялістычным прадпрыемстве і з'яўляецца партнёрам, таксама, безумоўна, добрасумленны ў сваіх адносінах да вытворчасці, і яго добрасумленнасць грунтуецца на тым, што выпрацаваная прадукцыя дазваляе яму задавальняць свае матэрыяльныя

патрэбнасці. Той жа, хто працуе за плату, не мае стымулу ў працы.

Незалежна ад таго, ці ідзе гаворка аб сферы грамадскіх паслуг або аб вытворчай сферы, наёмная праца бяссільная вырашыць пытанне росту вытворчасці і яе ўдасканалення, яна характарызуецца хранічным спадам, таму што заснавана на працы наёмных работнікаў.

Вось некаторыя прыклад прымянення наёмнай працы ў грамадскім і ў прыватным сектары і працы неаплочваемай.

I **Прыклад першы**

а) работнік вырабляе дзесяць яблыкаў для грамадства; грамадства за яго ўдзел у вытворчасці аддае яму адзін яблык, што цалкам задавальняе яго патрэбнасці;

б) работнік вырабляе дзесяць яблыкаў для грамадства; грамадства за яго ўдзел у вытворчасці дае яму адзін яблык, што менш той колькасці, якая задавальняе патрэбнасці работніка.

II **Прыклад другі**

Работнік вырабляе дзесяць яблыкаў для другога чалавека і атрымлівае за гэта плату ніжэй кошту аднаго яблыка.

III **Прыклад трэці**

Работнік вырабляе дзесяць яблыкаў для самога

сябе.

Вывады

У першым прыкладзе (а) работнік не стане павялічваць прадукцыйнасць, таму што як бы ён ні працаваў, ён атрымае толькі адзін яблык, што задаволіць яго патрэбнасці. Таму рабочая сіла, якая працуе на грамадства, вольна ці не, заўсёды пасіўная.

У першым прыкладзе (б) работнік не зацікаўлены ў вытворчасці, таму што вырабляе для грамадства, не атрымліваючы пры гэтым таго, што яму неабходна для задавальнення сваіх уласных патрэбнасцей. Аднак ён працягвае працаваць без усякага стымулу таму, што вымушаны падпарадкоўвацца агульным умовам працы, якія існуюць у грамадстве; і ў такім становішчы знаходзяцца ўсе слены грамадства.

У другім прыкладзе работнік працуе не дзеля таго, каб вырабляць, а каб атрымоўваць плату. Паколькі ж гэтыя плата недастатковая для задавальнення яго патрабаванняў, то работнік шукае другога гаспадара, якому ён здолее прадаць сваю працу даражэй, або вымушаны працягваць працаваць, каб выжыць.

І толькі ў трэцім выпадку мы маем перад сабой прыклад таго, калі работнік працуе не пасіўна і

не пад прымусам.

Паколькі ў сацыялістычным грамадстве адсутнічаюць магчымасці прыватнай вытворчасці, якая перабольшвае ўласныя патрабаванні індывідуума, і не дапускаецца задавальненя патрабаванняў адных за кошт іншых, паколькі сацыялістычныя прадпрыемствы працуюць дзеля задавальнення патрабавання грамадства ўвогуле, трэці прыклад, такім чынам, ілюструе здаровую аснову эканамічнай вытворчасці. Аднак нават у самых неспрыяльных умовах, вытворчы працэс працягваецца таму, што работнік вымушаны надтрымліваць сваё існаванне. Гэта відавочна пацвярджаецца тым фактам, што ў капіталістычным грамадстве вырабы множацца і засяроджваюцца ў руках нямногіх уласнікаў, якія, не працуючы самі, вымушаны ўдзельнічаць у вытворчасці, каб выжыць. Зялёная Кніга не толькі вырашае праблему матэрыяльнай вытворчасці, але і ўказвае шлях да ўсеахватнага вырашэння праблем чалавечага грамадства з мэтай канчатковага матэрыяльнага і духоўнага вызвалення асобы і дасягнення ўсеагульнага шчасця.

Іншыя прыклады

Дапусцім, што грамадскае багацце складаецца з дзесяці ўмоўных адзінак колькасць жыхароў таксама дзесяць. У гэтым выпадку на долю кожнага прыйдзецца 10:10, г. зн. адна адзінка грамадскага багацця. А калі нейкая колькасць членаў грамадства стане ўладальнікам большай часткі, то, значыць, другая частка членаў грамадства застанецца ні з чым, таму як іх частку грамадсткага багацця прысвояць іншыя. Таму ў эксплуатарскім грамадстве існуюць багатыя і бедныя.

Цяпер дапусцім, што з пяці членаў гэтага грамадства кожнаму належаць дзве адзінкі багацця. Тады пяцёра астатніх не будуць мець нічога, гэта значыць, пяцьдзесят працэнтаў членаў грамадства апынуцца без часткі грамадскага багацця, якая павінна ім належаць, паколькі кожны з першай пяцёркі мае дадатковую частку, якая з'яўляецца законнай часткай кожнага з другой пяцёркі.

Калі для задавальнення патрабаванняў кожнага члена грамадства дастаткова адной адзінкі грамадскага багацця, то такім чынам, той валодае грамадскім багаццем, большым, чым адна адзінка, па сутнасці, прысвойвае сабе частку астатніх членаў грамадства. Паколькі ж яго рэальная доля перавышае адзінку

грамадскага багацця, неабходную для задавальнення яго патрэбнасцей, то, такім чынам, ён прысвоіў як з мэтай абагачэння, абагачэнне ж немагчымае толькі за кошт патрэбнасцей іншых, за кошт долі грамадскага багацця, якая ім належыць. Менавіта ў гэтым заключаецца прычына існавання людзей, якія імкнуцца да абагачэння, не працяць, а накапліваюць звыш неабходнага ім для задавальнення сваіх патрэбнасцей, прычына існавання жаброкоў і абяздоленых, гэта значыць тых, хто, не маючы сродкаў існавання, выпрошвае долю грамадскага багацця, якая належыць ім па праву. Гэта крадзеж і грабеж, больш таго, гэта адкрыты, узаконены грабеж, які адпавядае жорсткім эксплуататарскім законам, што пануюць у гэтым грамадстве.

Лішкі, якія перавышаюць патрэбнасці, павінны належаць усім членам грамадства. Што ж датычыць асобных людзей, то, яны маюць права рабіць накапленні толькі за кошт сваіх уласных патрэбнасцей, бо накапленне звыш гэтых патрэбнасцей з'яўляецца замахам на грамадскае багацце.

Майстэрства і стараннасць умелых работнікаў не з'яўляецца для іх падставай прэтэндаваць на чужую долю, аднак яны могуць з выгадай выкарастоўваць гэтыя свае якасці для

задавальнення сваіх патрэбнасцей і рабіць накапленні за кошт уласных патрэбнасцей. Непрацаздольныя і непаўнацэнныя ад нараджэння людзі павінны атрымліваць тую ж долю грамадскага багацця, што і здаровыя.

Грамадскае багацце можна параўнаць з забеспячэнскай арганізацыяй або з прадуктовым складам, які штодзённа забяспечвае пэўную колькасць людзей правізіяй у колькасцях, неабходных для задавальнення іх штодзённых патрэбнасцей. Кожны з іх па свайму жаданню можаадкладваць з гэтай колькасці пра запас, гэта значыць, выкарыстоўваючы свае магчымасці і ўменні, спажываць, колькі лічыць патрэбным, а астатняе прыберагчы. Той жа, хто выкарыстоўвае свае здольнасці, каб атрымаць з грамадскага склада лішняе, з'яўляецца, безумона, злодзеем. Той, хто выкарыстоўвае сваё ўменне і спрыт для прысваення багацця ў звыш сваіх патрэбнасцей, па сутнасці, замахваецца на агульны здабытак - на грамадскае, якое ў гэтым выпадку параўноўваецца са складам.

Новае сацыялістычнае грамадства не дапускае адрозненяў у долі грамадскага багацця, што прыпадае на кожнага яе члена. Асобам, якія працуюць у сферы грамадскіх паслуг, грамадства

выдзяляе частку грамадскага багацця суразмерна іх працы. Доля кожнага адпавядае ступені яго ўдзелу ў аказанні грамадскіх паслуг. Такім чынам, перад намі новы вопыт, народжаны багаццем выдатнага гістарычнага мінулага, вопыт, які ўвенчвае барацьбу чалавека за поўнае вызваленне і шчасце шляхам задавальнення яго патрэбнасцей, за збаўленне ад эксплуатацыі іншым людзьмі, вопыт, які ставіць мяжу дэспатызму, пракладвае шлях да справядлівага размеркавання грамадскага багацця, калі кожны для задавальнення сваіх патрэбнасцей працуе сам на сябе, не прымушаючы працаваць на сябе іншых, і працуючы, не замаваецца на патрэбнасц іншых.

Такая тэорыя вызвалення патрэбнасцей чалавека ў імя вызвалення самога чалавека. Такім чынам, новае сацыялістычнае грамадства - не што іншае, як заканамерны вынік з дыялектыкі існуючых у свеце несправядлівых адносін, што натуральна параджаюць менавіта такое вырашэнне праблемы. Гэта - уласнасць, прызначаная для задавальнення ўласных патрэбнасцей людзей, атрымная без эксплуатацыі іншых людзей, і сацыялістычная ўласнасць, дзе вытворцы з'яўляюцца партнёрамі ў вытворчасці. Апошняя прыходзіць на змену

прыватнай уласнасці, заснаванай на працы наёмных работнікаў, пазбаўленых усіх правоў на вырабляемы імі прадукт.

Уладальнік жыллёвай плошчы, на якой жыве чалавек, сродкі перамяшчэння, якімі ён карыстаецца, сродкі існавання, на якія жыве, часткова або цалкам абмяжоўваюць свабоду чалавека; чалавек жа павінен быць свабодным, а каб быць свабодным, ён павінен распараджацца сваімі патрэбнасцямі сам.

Той, хто распараджаецца патрэбнасцямі другога, распараджаецца ім самім, эксплуатуе яго, а часам, насуперак існуючаму заканадаўству, і занявольвае яго.

Сродкі задавальнення асноўных уласных матэрыяльных патрэбнасцей, пачынаючы з адзення і ежы канчаючы сродкам перамяшчэння або жыллём, з'яўляюцца ўласнасцю чалавека, і ніякая арэнда тут недапушчальна. Арэнда гэтых сродкаў дае іх сапраўднаму ўладальніку, нават калі ім з'яўляецца само грамадства, магчымасць умешваецца ў чужое асабістае жыццё, распараджацца чужымі надзённымі патрэбнасцям і, такім чынам, чужой свабодай, пазбаўляючы чалавека шчасця. Так, уладальнік адзення мае права зняць з чалавека на вуліцы пакінуць яго голым, уладальнік сродку перамяшчэння, якім той карыстаецца, можа

высадзіць яго на скрыжаванні вуліц, а ўладальнік дома, дзе ён жыве, можа пакінуць яго без прытулку.

Па меншай меры несурьёзна спрабаваць кіраваць задавальненнем найпярвейшых патрэбнасцей чалавека з дапамогай юрыдычных адміністрацыйных і іншых мер, паколькі задавальненне іх з'яўляецца непахіснай асновай грамадства, якая вызначаецца яго натуральным законамі.

Мэта сацыялістычнага грамадства - шчасце чалавека, якое можна забяспечыць толькі ва ўмовах матэрыяльнай і духоўнай свабоды. У сваю чаргу дасягненне свабоды залежыць ад таго, наколькі свабодна чалавек распараджаецца сродкамі задавальнення ўласных патрэбнасцей і ў якой ступені яму забяспечана гэтае свяшчэннае права. Іншымі словамі, сродкі задавальнення ўласных патрэбнасцэй чалавека павінны быць яго ўласнасцю і не могуць быць аб'ектам пабочнага замаху. У адваротным выпадку чалавека ахоплівае неспакой, які пазбайляе яго шчасця, ён губляе сваю свабоду, паколькі жыве ў пастаянным страху, што хтосьці звонку замахнецца на яго асноўныя жыццёвыя патрэбнасці. Паварот сучасных грамадстваў ад прынцыпу наёмнай працы да прынцыпу

раўнапраўнага партнёрства непазбежны, як дыялектычны зыход непрымірымасці існуючых зараз у свеце эканамічных канцэпцый, як непазбежны і заканамерны вынік несправядлівых адносін, у аспове якіх ляжыць сістэма наёмнай працы - пытанне, не вырашанае і сёння.

Растучая моц рабочых прафсаюзаў у капіталістычным свеце здольна ператварыць капіталістычнае грамадства з грамадства наёмнай працы ў грамадства раўнапраўнага партнёрства.

Магчымасць здзяйснення сацыялістычнай рэвалюцыі пачынаецца з таго, што вытворцы авалодваюць сваёй доляй вырабленага прадукта. У гэтым выпадку мэтай рабочых забастовак будзе не павышэнне заработнай платы, а допуск да ўдзелу ў размеркаванні вырабленага прадукта. У адпаведнасці з палажэннямі Зялёнай Кнігі, гэта рана ці позна здзейсніцца.

Завяршаючым крокам з'яўіцца дасягненне новым сацыялістычным грамадствам стадыі, на якой канчаткова знікнуць прыбытак і грошы, калі грамадства стане цалкам прадукцыйным, а вытворчасць будзе цалкам задавальняць матэрыяльныя патрэбнасці ўсіх членаў грамадства. На гэтым заключным этапе

прыбытак знікне сам на сабе, і, значыць, перастануць існаваць і грошы.

Прызнаваць прыбытак - значыць прызнаваць эксплуатацыю, паколькі само гэта прызнанне адкрывае бязмежную прастору для атрымання прыбытку, бо ўсе спробы абмежаваць яго рознымі сродкамі - гэта рэфармісцкія спробы, не здольныя радыкальным чынам пакончыць з эксплуатацыяй чалавека чалавекам.

Канчатковае вырашэнне праблемы - гэта знішчэнне прыбытку. Але паколькі прыбытак з'яўляецца рухавіком эканамічнага развіцця, то ён не можа быць ліквідаваны адміністрацыйным шляхам, а знікне ў працэсе развіцця сацыялістычнай вытворчасці і задавальнення матэрыяльных патрэбнасцей грамадства ў цэлым і кожнага яго члена паасобку. У канчатковым выніку, да знікнення прыбытку вядзе праца ў імя павелічэння прыбытку.

Хатняя чэлядзь. У сучасным грамадстве хатняя чэлядзь, незалежна ад таго, працуе яна за плату ці бясплатна знаходзіцца ў рабскім стаповішчы. Гэта рабы новага часу. Паскольк і новае, сацыялістычнае грамадства заснавана не на зарплаце, а на прынцыпе партнёрства ў вытворчасці, хатняя чэлядзь аказваецца па-за сферай дзеяння натуральных сацыялістычных законаў, бо яна занята не ў галіне вытворчасці,

і ў сферы абслугоўвання, якая не вырабляе матэрыяльных даброт, што падлягаюць, у адпаведнасці з натуральным сацыялістычным законам, надзелу на роўныя долі. У сілу гэтага хатнія слугі павінны працаваць за плату і, ў крайнім выпадку, нават без яе.

Паколькі наёмныя работнікі ў сілу тых абставін, што яны працуюць за плату, з'яўляюцца свайго роду рабам і паколькі хатняя чэлядзь знаходзіцца на больш нізкай прыступцы ў параўнанні з наёмнымі работнкамі, занятымі ў разнастайных гаспадарчых установах і прадпрыемствах, то хатняя чэлядзь павінна быць вызвалена ад рабства грамадства наёмнай працы, - грамадства рабоў - у першую чаргу.

Хатняя чэлядзь, як грамадства з'ява, прыйшла на змену рабам. Трэцця Сусветная Тэорыя ўказвае масам шлях да канчатковага пазбаўлення ад путаў прыгнёту, заняволення, эксплуатацыі, палітычнага і эканамічнага панавання ў імя пабудовы грамадства, якое аб'ядновае ўсіх людзей, - грамадства, у якім усе людзі свабодныя, паколькі ўсе яны, у імя канчатковай поўнай перамогі Свабоды, маюць роўныя правы на ўладу багацце і зброю.

Зялёны Кніга ўказвае масам наёмных работнкаў і хатняй чэлядзі шлях да вызвалення ў імя Свабоды чалавека. Таму трэба змагацца за

пазбаўленне хатняй чэлядзі ад путаў рабства і ператварэнне іх у партнёраў, занятых у сферы матэрыяльнай вытворчасці, прадукцыя якой падзяляецца на часткі па колькасці элементаў вытворчасці. Жыллё павінна абслугоўвацца тымі, хто ў ім жыве. У тых выпадках, калі ўдзел работнікаў усё ж неабходны, хатняя работа павінна выконвацца не чэлядзю, якая працуе за плату або бясплатна, а работнікамі, якія карыстаюцца правам павышэння па службе і маюць тыя ж сацыяльныя і матэрыяльныя гарантыі, што астатнія работнікі сферы грамадскіх паслуг.

Муамар КАДДАФІ

ЗЯЛЁНАЯ КНІГА

Частка трэцця

ГРАМАДСКІ АСПЕКТ
ТРЭЦЯЙ СУСВЕТНАЙ ТЭОРЫІ

ГРАМАДСКІ АСПЕКТ ТРЭЦЯЙ СУСВЕТНАЙ ТЭОРЫІ

Грамадскі, г. зн. нацыянальны фактар з'яўляецца рухавіком гісторыі чалавецтва. Асновай гістарычнага развіцця з'яўляецца грамадская сувязь, якая аб'ядноўвае людзей у супольнасці, пачынаючы з сям'і і канчаючы племенем і нацыяй.

ГЕРОІ ГІСТОРЫІ - ГЭТА АСОБЫ, АХВЯРУЮЧЫЯ САБОЮ Ў ІМЯ АГУЛЬНАЙ СПРАВЫ. Іншага вызначэння быць не можа. Пытанне ў тым, якая гэта справа? Яны ахвяруюць сабой дзеля іншых. Але хто такія гэтыя іншыя? Іншыя - гэта звязаныя з імі людзі. Сувязь паміж асобай і калектывам ёсць сувязь грамадская, іншымі словамі, узаемная сувязь людзей. Аснова, якая стварае нацыянальную супольнасць, - нацыянальная самасвядомасць, такім чынам, гэтыя праблемы ёсць праблемы нацыянальныя.

Нацыянальныя сувязь з'яўляецца сувяззю грамадскай, г. зн. сувяззю паміж супольнасцям людзей. Слова "грамадскі" паходзіць ад таго ж кораня, што слова "супольнасць", слова "нацыянальны" паходзіць ад таго ж кораня, што слова "нацыя", такім чынам, нацыянальныя сувязь - гэта сувязь людзей, як часцінак нацыі, аднаго з другім. Таму грамадская сувязь - гэта нацыянальная сувязь, бо супольнасць, незалежна ад сваёй колькасці, мяркуе пэўную нацыянальную сукупнасць, а нацыя ўяўляе сабою супольнасць.

Мы не ўваходзім тут у дэталі вызначэння паняцця "супольнасць" і не разглядаем яе як з'яву часовую, незалежную ад нацыянальных сувязей паміж яе членамі. Пад словам "супольнасць" мы маем на ўвазе з'яву пастаянную, якая вызначаецца нацыянальнымі сувязямі.

Усе існаваўшыя ў гісторыі рухі - гэта заўсёды масавая, г. зн. калектыўныя рухі, г. зн. рухі членаў пэўнай супольнасці ў імя сваіх інтарэсаў, напрыклад, у імя сваёй незалежнасці ад іншай супольнасці, з тым, каб кожная з іх магла выступаць як самастойнае грамадскае ўтварэнне. Рухі чалавечых супольнасцей заўсёды з'яўляюцца рухамі за незалежнасць, калі прыгнечаная ці бяспраўная супольнасць

імкнецца да самасцвяржэння, да вызвалення ад сваёй залежнасці ад іншай супольнасці. Што ж датычыць барацьбы за ўладу, дык яна, як показана ў першай часцы Зялёнай Кнігі (Палітычны аспект Трэцяй Сусветнай Тэорыі), адбываецца ўнутры грамадства на розных ўзроўнях, аж да сям'і. Рух супольнасці - гэта рух пэўнай сукупнасці людзей у імя сваіх інтарэсаў, паколькі асобная супольнасць у сілу працэсу натуральнага фарміравання адзіная, яна мае аднолькавыя грамадскія патрэбнасці, якія можна забяспечыць толькі сумесна. Гэтыя патрэбнасці, правы, патрабаванні, мэты з'яўляюцца не індывідуальнымі, а, наадварот, агульнымі для сукупнасці людзей, звязаных адзінай нацыянальнай прынадлежнасцю. Таму гэтыя рухі называюцца нацыянальнымі. Нацыянальна-вызваленчыя рухі сучаснай эпохі з'яўляюцца грамадскімі рухамі. Яны будуць працягвацца да таго часу, пакуль кожна нацыянальная супольнасць не вызваліцца ад панавання другой супольнасці. Іншымі словамі, свет цяпер перажывае адну са звычайных стадый гістарычнага працэсу - стадыю нацыянальнай барацьбы ў імя перамогі нацыянальнай самасвядомасці.

Такая гістарычная праўда чалавечага грамадства. Гэта грамадская ісціна. Іншымі

словамі, асновай руху гісторыі з'яўляецца нацыянальная барацьба, грамадская барацьба, паколькі яна, будучы першапрычынай і асновай усяго, закладзена ў самой прыродзе чалавечай супольнасці, прыродзе нацыянальнай супольнасці. Больш таго, складаючы прыроду самога жыцця, яна з'яўляецца наймагутнейшым з усіх фактараў развіцця. Акрамя чалавека, усе іншыя жывыя істоты таксама жывуць як супольнасці: супольнасць - гэта аснова існавання ў свеце жывых істот. Нацыянальная самасвядомасць - гэта аснова захавання нацый. Нацыі, якія страцілі нацыянальную самасвядомасць, асуджаны на гібель. Праблема нацыянальных меншасцей, як адна з палітычных праблем сучаснага свету, носіць грамадскі характар, паколькі меншасці - гэта народы, якія страцілі нацыянальную самасвядомасць і, як вынік, падсеклі саму аснову свайго існавання. Грамадскі фактар - гэта фактар жыцця, фактар існавання. Таму ён з'яўляецца натуральным і аўтаномным рухавіком нацыянальнай супольнасці, забяспечвае яе існаванне.

Нацыянальную самасвядомасць у свеце Чалавека, у свеце ўсяго жывога, можна параўнаць з сілай прыцягнення ў свеце нежывой прыроды і нябесных цел. Калі б Сонца страціла сілу прыцягнення, састаўляючыя яго

газы рассеяліся б у прасторы і Сонца перастала б існаваць. У аснове існавання Сонца ляжыць маналітнасць гэтых газаў. Такім чынам, асновай існавання з'яўляецца фактар яднання. Грамадскі фактар, г. зн. нацыянальная самасвядомасць - гэта фактар яднання любой супольнасці. Менавіта таму супольнасці змагаюцца дзеля нацыянальнай еднасці, бачачы ў ёй залог свайго існавання.

Нацыянальны фактар, г. зн. грамадская сувязь, спантанна падахвочвае нацыянальную супольнасць людзей да самазахавання, падобна таму, як сіла прыцягнення спантанна заховае ў фізічнае цела, утрымліваючы яго часткі ў адзінай масе вакол ядра. Вызваленне часцінак, якое ляжыць у аснове тэорыі стварэння атамнай бомбы, узнікае ў выніку расшчаплення ядра, што з'яўляецца цэнтрам прыцягнення электронаў, што рухаюцца вакол яго. Калі адзінства гэтых часцінак разбураецца і сіла прыцягнення страчваецца, кожная часцінка становіцца свабоднай, на чым і заснаваны прынцып дзеяння атмнай бомбы. Такая прырода ўсіх рэчаў. Гэта - непахісны закон прыроды і, ігнаруючы яго ці ідучы насуперак, чалавек парушае ход жыцця. Ход жыцця людзей таксама парушаецца, калі нацыянальная самасвядомасць, як грамадскі фактар, як фактар

узаемнага прыцягнення і аснова існавання супольнасці, ігнаруецца або ўстунае з ім супярэчнасць.

На ступені ўплыву на адзінства гэтай супольнасці з грамадскім фактарам можа супернічаць толькі рэлігійный фактар, які часам раз'ядноўвае нацыянальную супольнасць ці, наадварот, аб'ядноўвае супольнасці, якія належаць да розных нацыянальнасцей. Але ў канчатковым выніку верх заўсёды бярэ грамадскі фактар. Так было на працягу ўсёй гісторыі. Гістарычна кожна нацыянальная супольнасць павінна мець сваю рэлігію. Толькі пры гэтай умове магчыма гармонія. Аднак у жыцці бывае інакш і менавіта ў гэтым заключаецца сапраўдная прычына канфліктаў і нестабільнасці ў жыцці народаў у розныя эпохі.

Асноватворны прынцып зводзіцца да таго, што кожны народ павінен мець сваю рэлігію. Выключэнні толькі пацвярджаюць правіла. Падобныя выключэнні ствараюць ненармальнае становішча, якое становіцца сапраўднай прычынай канфліктаў унутры адзінай нацыянальнай супольнасці. Адзіны шлях да ліквідацыі гэтых канфліктаў - аднавіць парушанае натуральнае правіла, у якім гаворыцца, што кожныя нацыя павінна мець сваю рэлігію. Толькі тады грамадскі фактар

прыйдзе ў адпаведнасць з рэлігійным фактарам і будзе адноўлена гармонія. Жыццё чалавечых супольнасцей стабілізуецца і будзе развівацца ў патрэбным напрамку.

Шлюб - гэта інстытут, які аказвае на грамадскі фактар як станоўчае, так і адмоўнае ўздзеянне. Хаця як мужчына, так і жанчына маюць натуральнае права свабоднага выбару, тым не менш шлюб унутры адной супольнасці, зразумела, умацоўвае яе адзінства, садзейнічае яе планамернаму росту, які гарманіруе з грамадскім фактарам.

СЯМ'Я

СЯМ'Я

Для чалавека, як асобнай асобы, сям'я важней за дзяржаву. Чалавецтва мае справу з такім паняццем, як асоба (чалавек), а нармальная асоба (чалавек) - з паняццем сям'я. Сем'я - гэта калыска чалавека, яго бацькоўскі дом, яго сацыяльная абарона. Спаконвечнае чалавецтва - гэта Асоба і Сям'я, але зусім не Дзяржава. Чалавецтва не ведае такога паняцця, як дзяржава. Дзяржава - гэта штучная палітычная, эканамічная, а часам і ваенная будова, ніяк не звязаная з паняцем "чалавецтва" і якая не мае да яго ніякіх адносін. Сям'ю ў свеце прыроды можна параўнаць з асобнай раслінай, якая з'яўляецца асновай раслiннага свету. Культываванне раслін на плантацыях, у садах і да т. п. носіць штучны характар і не мае нічога агульнага з прыродах раслін, якія складаюцца як сям'я з мноства галінак, ліcця і кветак. Тое, што палітычныя, эканамічныя і ваенныя фактары прыстасавалі вялікае мноства сям'яў да існавання ў рамках дзяржавы, не мае да чалавецтва ніякіх адносін. Любая сітуацыя, абставіна ці мерапрыемства, якія вядуць да

распаду сям'і або яе выраджэнню, не толькі пегуманныя і супярэчаць прыродзе, але і з'яўляюцца насіллем над прыродай накшталт таго, як абломліванне галінак расліны ці абрыванне яе кветак і лісцяў прыводзіць да завядання і гібелі расліны.

Грамадства, дзе з-за нейкіх умоў існуе пагроза адзінству сям'і і яе існаванню, на гадвае плантацыю, дзе расліны могуць быць вырваны з коранем, засохнуць ад недахопу вільгаці і загінуць ад агню і засухі ці проста завянуць. Чалавечае грамадства нагадвае квітнеючы сад ці апрацаваную ніву, дзе расліны развіваюцца натуральна, цвітуць, даюць завязь, ідуць у рост. Працвітаючае грамадства - гэта грамадства, у якім чалавек натуральна развіваецца ва ўмовах сям'і, грамадства, у якім працвітае сям'я, з якой чалавек звязаны трывалымі вузамі. Ён падобны лістку, як трывала сядзіць на галінцы, - існаванне яго без галінкі немагчымае. Так і існаванне чалавека без сям'і пазбаўлена сэнсу і грамадскага зместу. Калі чалавечае грамадства стане калі-небудзь грамадствам без сям'і, яно будзе грамадствам бадзяг і будзе нагадваць ліпучную расліну.

Племя

Племя - гэта тая ж сям'я, толькі павялічаная з-за росту патомства, г. зн. племя - гэта вялікая сям'я. Нацыя - гэта племя, але племя, якое разраслося ў выніку павелічэння патомства, г. зн. нацыя - гэта вялікае племя. Свет - гэта нацыя, але нацыя, якая падзялілася на мноства нацый выніку росту насельніцтва, г. зн. свет - гэта вялікая нацыя. Сувязі, якія фарміруюць сям'ю, - гэта тыя ж сувязі, якія фарміруюць племя, нацыю і свет, толькі па меры павелічэння колькасці гэтых супольнасцей гэтыя сувязі становяцца ў сё больш слабымі. Чалавецтва - гэта міжнацыянальныя сувязі, нацыя - гэта міжплямённыя сувязі, племя - гэта міжсямейныя сувязі. Трываласць гэтых сувязей знізу ўверх слабне. Гэта агульнавядомая ісціна, адмаўляць якую немагчыма.

Такім чынам, грамадская сувязь, спаянасць, адзінства, каханне і прыхільнасць на ўзроўні

сям'і больш трывалыя, чым на ўзроўні племені, на ўзроўні племені больш трывалыя, чым на ўзроўні нацыі, і на зроні нацыі больш трывалыя, чым на сусветным узроўні. Інтарэсы, прывілеі, каштоўнасці і ідэалы, вызначаемыя гэтымі грамадскімі сувязямі, існуюць там, дзе гэтыя грамадскія сувязі абумоўлены і трывалыя па самой сваёй прыродзе, г. зн. на ўзроўні сям'і яны больш трывалыя, чым на ўзроўні племені, на ўзроўні племені больш трывалыя, чым на зроні нацыі, і на ўзроўні нацыі больш трывалыя, чым на сусветным узроўні.

Па меры таго, як знікае сям'я, племя, нацыя і чалавецтва, губляюцца і грамадскія сувязі, а разам з імі і вызначаемыя імі каштоўнасці, прывілеі і ідэалы. ТАМУ, КАБ МЕЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ КАРЫСТАЦЦА КАШТОЎНАСЦЯМІ, ПРЫВІЛЕЯМІІ ІДЭАЛАМІ, ЯКІЯ СТВАРАЮЦЦА ЎЗАЕМАСУВЯЗЗЮ, ЗГУРТАВАНАСЦЮ, АДЗІНСТВАМ, ПРЫХІЛЬНАСЦЮ І КАХАННЕМАЎЗРОЎНІ СЯМ'І, ПЛЕМЕНІ, НАЦЫІ І ЎСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА, ДЛЯ ЧАЛАВЕЧАГАГРАМАДСТВАНАДЗВЫЧАЙ ВАЖНАЗАХАВАЦЬЗГУРТАВАНАСЦЬЯКНА ЎЗРОЎНІ СЯМ'І, І ПЛЕМЕНІ, ТАК І НА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ І СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНЯХ.

У сацыяльным плане з пункту гледжання ўзаемасувязей, узаемнай міласэрнасці, салідарнасці і інтарэсаў сямейнае грамадства мае большую перавагу, чым грамадства пляменнае, пляменнае - больш, чым грамадства нацыянальнае, нацыянальнае - больш, чым інтэрнацыянальнае.

ПЕРАВАГІ ПЛЕМЕНІ

Паколькі племя - гэта вялікая сям'я, то яно забяспечвае сваім членам тыя ж матэрыяльныя патрэбнасці і сацыяльныя пераваг, што сям'я членам. Племя - гэта сям'я на наступнай стадыі. Неабходна падкрэсліць, што чалавек без сям'і можа часам паводзіць сябе ганебна, чаго не зрабі бы ў сям'і, аднак паскольк сям'я невялікая, ён не адчувае над сабою яе кантролю. Інакш ідуць справы ў рамках племені, дзе члены адчуваюць сябе свабоднымі ад кантролю. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, племя выпрацавала для сваіх членаў нормы паводзін, якія сталі формай грамадскага выхавання, што валодае большымі вартасцямі, чым любое школьнае выхаванне. Племя - гэта сацыяльная школа, у якой чалавек з дзяцінства засвойвае сукупнасць прынцыпаў, якія з цягам часу жыццёвай нормай паводзін і

па меры сталення рэфлекторна замацоўваюцца ў яго свядомасці. Інакш з навыкамі і ведамі, якія замацоўваюцца ў працэсе фармальнага выхавання і навучання, якія па меры таго, як чалавек сталее, паступова губляюцца, бо гэтыя фармальныя навыкі атрыманы эмпірычным шляхам, і чалавек разумее, што яны прывітыя яму штучна.

Племя - гэта натуральная сацыяльная абарона чалавека, якая забяспечвае яго сацыяльныя патрэбнасці. У адпаведнасці з прынятымі сацыяльнымі традыцыямі племя калектыўна забяспечвае выкуп сваіх членаў, сумесна плаціць за іх штраф, сумесна помсціць за іх, калектыўна іх абараняе - іншымі словамі, ажыццяўляе іх сацыяльную абарону.

Кроўная роднасць з'яўляецца асноўным, але не адзіным фактарам, фарміравання племені, паколькі існуе яшчэ і далучэнне. З цягам часу адрозненні паміж членамі племені, звязанымі кроўнай роднасцю і тымі, хто далучыўся да племені, знікаюць, і племя становіцца адзіным сацыяльным і этнічным утварэннем. Тым не менш гэтае адзінства ў першую чаргу заснавана на кроўнай роднасці і агульным паходжанні.

НАЦЫЯ

Нацыя забяспечвае чалавеку больш шырокую палітычную і нацыянальную абарону, чым племя. Трайбалізм, адданасць свайму племені, падрывае нацыянальныя пачуцці, аслабляе адданасць сваёй нацыі і ідзе ёй на шкоду, таксама ж, як адданасць чалавека сям'і наносіць шкоду яго адданасці свайму племені і аслабляе яе. Нацыянальны фанатызм, нават у той меры, у якой ёе уласцівы нацыі, уяўляе сабой пагрозу чалавецтву.

Нацыя ў рамках сусветнай супольнасці - тое ж самае, што сям'я ў рамках племені. Чым мацней узаемная варожасць паміж сям'ямі, якія складаюць племя, чым мацней унутрысямейныя сувязі, тым большую пагрозу сям'я ўяўляе для племені. Аналагічная з'ява адбываецца ўнутры сям'і: чым мацней непрыязь паміж яе членамі,

тым больш настойліва кожны з іх адстойвае асабістыя інтарэсы, тым большая пагроза ўзнікае існаванн сям'і. Калі плямёны, якія ўтвараюць нацыю, знаходзяцца ў варожасці і кожнае племя настойліва адстойвае толькі свае інтарэсы, існаванне нацыі ставіцца пад пагрозу. Нацыянальны фанатызм, прымяненне нацыянальнай сілы супраць слабых нацый, а таксама прагрэс адной нацыі ў выніку захопу здабытку другой нясуць зло і шкоду ў сяму чалавецтву.

Тым не менеі, моцны, паважаючы сябе чалавек, які ўсведамляе меру асабістай адказнасці, неабходны і карысны для сям'і. Моцная, паважаючыя сябе сям'я, якая ўсведамляе сваё значэнне, у сацыяльных і матэрыяльных адносінах карысная для племені. Развітая цывілізаваная прадукцыйная нацыя карысная цэламу свету. Палітычная і нацыянальная структура дэградуе, калі апускаецца да ўзроўню сацыяльных катэгорый, г. зн. да сямейнага і пляменнага ўзроўняў, узаемадзейнічае з імі і прымае іх у разлік.

Нацыя - гэта вялікая сям'я, прайшоўшая шлях развіцця ад племені да сукупнасці плямёнаў, якія маюць агульнае паходжанне або зліліся разам з-за агульнасці лёсу. Сям'я можа стаць нацыяй, толькі прайшоўшы стадыю племені, дзялення

племені і, далей стадыю змяшэння плямёнаў. Гэты сацыяльны працэс носіць працяглы характар. Аднак натуральны ход часу, які садзейнічае, з аднаго боку, станаўленню новых нацый, прыводзіць, з другога, да драблення старых. Разам з тым гістарычнай асновай утварэння любой нацыі застаецца і агульнасць паходжання і агульнасць лёсу, прычым адзінства паходжання адыгрывае пануючую, а агульнасць лёсу - другарадную. Нацыя - гэта не толькі агульнасць паходжання, хоць гэтая прыкмета з'яўляецца зыходнай. Нацыя ўяўляе сабою чалавечы кангламерат, які гістарычна склаўся, пражывае на адной тэрыторыі, стварае адзіную гісторыю, адзіную культурную спадчыну і мае адзіны лёс. Такім чынам, акрамя фактара кроўнай родасці, для фарміравання нацыі канчатковым выніку важны факт ЗЛІЦЦЯ НА АСНОВЕ АГУЛЬНАСЦІ ЛЁСУ.

Але чаму на карце свету вялікія дзяржавы знікаюць, а на іх месцы ўзнікаюць іншыя? Ці ляжыць у аснове гэтага палітычная прычына, якая не мае адносін да грамадскага аспекту Трэцяй Сусветнай Тэорыі, або гэта прычына грамадскага характару, непасрэдна звязаная з гэтым раздзелам Зялёнай Кнігі? Давайце паглядзім.

Бясспрэчна, сям'я ўяўляе сабою сацыяльнае, а

не палітычнае ўтварэнне. Тое ж самае тычыцца і племені, паколькі яно ўяўляе сабою сям'ю, якая разраслася ў выніку росту патомства і ператварылася ў мноства сям'яў. Нацыя - гэта племя, якое выросла колькасна, раздрабілася на новыя калены і новыя плямёны.

Нацыя таксама з'яўляецца сацыяльным утварэннем, у аснове якога ляжаць нацыянальныя сувязі. Племя - сацыяльнае ўтварэнне, якое ўзнікала на аснове племянных сувязей, сям'я - сацыяльнае ўтварэнне на аснове сямейных сувязей. Сацыяльнымі ўтварэннямі з'яўляецца і нацыі свету, спаяны агульначалавечым сувязямі. Усё гэта аксіёматычна. Дзяржава ж з'яўляецца палітычным утварэннем. Дзяржавы ўтвараюць палітычную карту свету. Але ўсё ж такі чаму з веку ў век гэтая карта мянялася? Прычына ў тым, што дзяржава як палітычнае ўтварэнне можа адпавядаць грамадскаму ўтварэнню альбо не адпавядаць. Калі дзяржава аднанацыянальная, дык яна існуе доўга і без змяненняў, а калі ў выніку каланізацыі звонку ці ўпадку яна змяняецца, дык пад лозунгамі нацыянальнай барацьбы, нацыянальнага адраджэння і нацыянальнай еднасці ўзнікае зноў. Калі ж дзяржава як палітычнае ўтварэнне аб'ядноўвае больш як адну нацыю, дык яе

палітычная структура ў выніку імкнення кожнай нацыі да нацыянальнай незалежнасці развальваецца. Так з вядомымі сусветнымі імперыямі, бо ўсе яны ўяўлялі сабою сукупнасць нацый, кожная з якіх з-за сваіх нацыяналістычных памкненняў стала дабівацца незалежнасці, што і прывяло да распаду імперый, як палітычных утварэнняў, а ўтвараючыя іх элементы прыйшлі ў адпаведнасць са сваёй грамадскай асновай. Яркія доказы гэтага мы знаходзім на працягу ўсёй гісторыі свету.

Але чаму ж тады на аснове аб'яднання розных нацый узнікаюць імперыі?

Справа ў тым, што дзяржава, у адрозненне ад племені, з'яўляецца не толькі грамадскім утварэннем. Дзяржава - гэта палітычнае ўтварэнне, якое ўзнікла пад уздзеяннем цэлага шэрагу фактараў, зыходным і асноўным з якіх з'яўляецца нацыянальная самасвядомасць. Нацыянальная дзяржава - гэта адзіная палітычная форма, якая адпадвядае натуральнаму грамадскаму ўтварэнню. Такая дзяржава можа існаваць вечна, калі не стане аб'ектам замаху другой, больш моцнай нацыі, або калі палітычная структура такой дзяржавы не падвергнецца ўплыву з боку яе грамадскай структуры, а менавіта, з боку плямёнаў, клана і

сям'яў. Калі палітычная структура трапіць у падначаленне грамадскай - пляменнай, кланавай ці абшчыннай - і падпадае пад яе ўздзеянне, яна разлагаецца.

Іншымі фактарамі, якія фарміруюць дзяржаву (маецца на ўвазе не простая, аднанацыянальная дзяржава), з'яўляюцца рэлігійныя, эканамічныя і ваенныя фактары.

Адзіная рэлігія можа абяднаць у адну дзяржаву некалькі нацый. Абяднанне магчыма таксама ў сілу эканамічнай неабходнасці і ваенных заваёў. Такім чынам, свет становіцца сведкай таго, як дзяржава або імперыя, якія існавалі ў адну эпоху, знікаюць у другую. Калі нацыянальны дух аказваецца мацнейшым за рэлігійны дух, то барацьба паміж рознымі нацыямі, да гэтага аб'яднаным адной рэлігіяй, узмацняецца, і кожная з гэтых нацый дабіваецца незалежнасці, вяртаючыся да ўласцівай ёй грамадскай структуры, а імперыя знікае. Затым, калі рэлігійны дух атрымлівае верх над нацыянальным духам і розныя нацыі аб'ядноўваюцца пад сцягам адзінай рэлігіі, адбываецца адваротнае, далей зно верх атрымлвае нацыянальны дух і г. д.

Усякая дзяржава, якая аб'ядноўвае некалькі нацый, у сілу дзеючых рэлігійных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных прычын і фактараў будзе

раздзірацца нацыянальнай барацьбой, пакуль кожная нацыя не даб'ецца незалежнасці, г. зн. пакуль грамадскі фактар капчаткова не пераможа палітычны.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што існаванне дзяржавы прадыктавана палітычнай неабходнасцю, аснову жыцця чалавека складае семя, племя, нацыя і, нарэшце, усё чалавечае грамадства. Грамадскі фактар - гэта асноўны і пастаянны фактар нацыянальнай самасвядомасці. Таму неабходна рабіць упор на сацыяльную рэчаіснасць, удзяляючы ўвагу сям'і дзеля выхавання нармальна развітога чалавека, далей - племені, як грамадскай абароне і як натуральнай сацыяльнай школе, дзе чалавек, акрамя сям'і атрымлівае сваё грамадскае выхаванне, а затым і нацыі, наколькі чалавек спасцігае сапраўдны сэнс сацыяльных каштоўнасцей праз сям'ю і племя, якія з'яўляюцца натуральнымі грамадскімі ўтварэннямі, што ўзніклі без умяшання звонку. Такім чынам, увага да сям'і дзеля чалавека, увага да племені дзеля сям'і і тым самым дзеля чалавека, увага да нацыі - ёсць нацыянальная самасвядомасц, паколькі нацыянальны фактар як фактар грамадскі з'яўляецца сапраўдным і пастаянным рухавіком гісторыі.

Ігнараванне нацыянальных сувязей чалавечых

супольнасцей і стварэнне палітычных сістэм, якія ідуць уразрэз з сацыяльнай рэчаіснасцю, можа насіць толькі часовы характар, паколькі такія сістэмы непазбежна падуць пад уздзеяннем грамадскага фактару, г. зн. пад уздзеяннем нацыянальных пабуджэнняў нацыі. Усё гэта надуманыя схемы, а ісціны, якія складаюць сапраўдную аснову жыцця чалавека. Каб не памыліцца, кожны чалавек у гэтым свеце павінен усвядомціь гэта і аднаведна дзейнічаць. Веданне гэтых непахісных ісцін неабходна для таго, каб пазбегнуць любых адхілення і промахаў, не парушаць цячэнне жыцця чалавечых супольнасцей з-за неразумення і непавагі асноў чалавечага быцця.

ЖАНЧЫНА

ЖАНЧЫНА

Жанчына - чалавек. Мужчына - таксама чалавек. Гэта бясспрэчная і безумоўная ісціна. Такім чынам, жанчына і мужчына ў роўнай ступені падзі рабць адрозненні паміж імі як людзьмі - гэта яўная і інчым не апраўданая несправядлівасць. Жанчына, як і мужчына, есць і п'е, ненавідзіць і кахае, мысліць, вучыцца і разумее. Жанчыне, як і мужчыну, патрэбен дом, адзенне і сродак перамяшчэнне. Жанчына, як і мужчына, адчувае голад і смагу; як і мужчына, жанчына жыве і памірае.

Й ?сё мужчыны - гэта мужчына, а жанчына - гэта жанчына. Чаму? Чаму чалавечае грамадства не складаецца з адных мужчын ці з адных жанчын, а складаецца і з тых і з другіх? Г. зн. мужчына і жанчына створаны самой прыродай. Чаму ж прырода не стварыла толькі адных мужчын ці толькі адных жанчын? У чым адрозненне паміж мужчынамі і жанчынамі, г. зн. паміж мужчынай і жанчынай? Чаму прырода стварыла іх абодвух?

Відаць, існаванне іх абодвух, мужчыны і жанчаны адначасова, з'яўляецца натуральнай неабходнасцю. Такім чынам, кожны з іх не такі, як другі, і, значыць, адрозненне паміж імі прадвызначана самой прыродай, што пацвярджаецца існаваннем на Зямлі абодвух адначасова. Адсюль вынікае, што кожнаму з іх прызначана свая асаблівая роля, якая адрозніваецца ад ролі другога. Таму кожны з іх павінен мець умовы для выканання сваёй ролі, непадобнай на ролю другога, якому неабходныя для выканання прызначанай яму прыродай ролі іншыя ўмовы. Каб зразумець, якая яна, гэтая роля, неабходна высветліць, у чым заключаецца адрозненне арганізмаў мужчыны і жанчыны, г. зн. якія адрозненні, закладзеныя ў іх самой прыродай.

Жанчына - асобіна жаночага полу. Мужчына - асобіна мужчынскага полу. З прычыны гэтага, як кажа ўрач-гінеколаг, жанчына "мае менструацыі, г. зн. рэгулярнае захворванне ў выглядзе штомесячных кровацёйкаў". Мужчынскаму арганізму гэтая з'ява не ўласцівая. Жанчына, будучы на прыродзе істотай Жаночага полу, мае штомесячныя кровацёкі. Калі ж гэтага не адбываецца, значыць, у яе наступіла цяжарнасць. У перыяд цяжарнасці жанчына знаходзіцца ў хваравтіым стане амаль

год. У гэты час яна пазбаўлена магчымасці займацца сваёй звычайнай дзейнасцю. Працэс родаў, нармальных ці заўчасных, звязаны для жанчыны з родавымі пакутамі. Далей, жанчына корміць сваё дзіця грудзьмі, што пры нармальных умовах працягваецца каля двух гадоў. Працэс натуральнага кармлення азначае, што дзіця знаходзіцца пры маці і маці - пры дзіцяці, што таксама пазбаўляе жанчыну магчымасці займацца звычайнай дзейнасцю, паколькі ў гэты перыяд яна нясе непасрэднаю адказнасць за іншага чалавека і дапамагае яму ў выкананні яго жыццёвых функцый, бо без яе дапамогі дзіця загіне. Мужчына ж ад усяго гэтага свабодны. Такое меркаванне ўрача-спецыяліста.

Гэтыя прыродныя даныя, якія прадвызначаюць натуральнае адрозненне паміж мужчынам і жанчынай, робяць немагчымым роўнасць паміж імі і ў той жа час прадвызначаюць неабходнасць існавання іх абодвух: і мужчынскіх, і жаночных асобін. Кожнаму з іх жыцці адведзена асаблівая роля ці функцыя, якая адрозніваецца ад ролі і функцыі другога, і ніводны з іх ніякім чынам не можа замяніць другога, г. зн. мужчына не можа выконваць функцыі, прызначаныя прыродай жанчыне. Трэба ўзяць пад увагу, што гэтыя біялагічныя функцыі для жанчыны - вялікі

цяжар, звязаны з немалой затратай сіл і пакутамі, аднак без той функцыі, якую выконвае жанчына, спынілася б чалавечае жыццё. Гэтая функцыя прадвызначана самой прыродай, не прынята жанчынай добраахвотна, не навязана ёй кімсьці. Акрамя гэтага, гэтая функцыя абавязковая, бо без яе перарвецца жыццё роду чалавечага.

Існуе адвольнае ўмяшанне для прадухілення зачацця, якое ўносіць чалавечае жыццё, адвольнае ўмяшанне пры родах, існуе таксама адвольнае ўмяшанне пры кармленні. Аднак усе гэтыя віды ўмяшання - звенні ў адным ланцугу дзеянняў, накіраваных супраць натуральнага жыцця, крайняй мяжой чаго з'яўляецца забойства, калі жанчына, не жадаючы зацяжарэць, радзіць, карміць дзіця, забівае ў сабе сваю сутнасць, што не адрозніваецца ад любога іншага віду пабочнага ўмяшання ў саму прыроду жыцця, якое выражаецца ў гэтым выпадку ў цяжарнасці, родах, кармленні, мацярынстве, шлюбе, хоць маштабы такога ўмяшання разнастайныя.

Тэндэнцыя пазбавіць жанчыну яе натуральнай ролі маці замяніць яе як маці яслямі кладзе пачатак адмаўленню ад гуманнага, чалавечага грамадства і ператварэнню яго ў біялагічнае грамадства, якое жыве штучным жыццём.

Аддзяленне дзяцей ад сваіх маці і ўтрыманне іх у яслях ператварае іх падобнасць куранят, прычым самі яслі можна параўнаць з птушкафермамі, дзе адкормліваюць інкубатарскіх куранят. Толькі натуральнае мацярынства, калі дзіця выхоўвае ўласная маці, дапушчальнае ў чалавечым грамадстве, адпавядае прыродзе чалавека і яго годнасці.

ДЗІЦЯ ПАВІННА РАСЦІ Ў СЯМ'І, У АКРУЖЭННІ МАЦІ І БАЦЬКІ, БРАТОЎ І СЯСЦЁР, а не на птушкаферме. Куранятам, як і астатнім прадстаўнікам жывёльнага свету, таксама патрэбна маці, а вырошчванне іх на птушкафермах, якія падобныя яслям, затрымлівае іх натуральнае развіццё. Мяса такой птушкі падобнае на штучнае, яно непрыемнае на смак і, магчыма, не карыснае, таму што гэта птушка расла ў штучна створаных умовах, не ведала мацярынскага клопату. Мяса дзікай птушкі больш смачнае і пажыўнае, таму што яна расла ва ўмовах натуральнага мацярынскага клопату і атрымлівала нармальнае харчаванне.

ДЗЕЦІ, ЯКІЯ НЕ МАЮЦЬ СЯМ'І ДОМА, ВЫХОЎВАЮЦЦА ГРАМАДСТВАМ. ТОЛЬКІ ДЛЯ ГЭТЫХ ДЗЯЦЕЙ ГРАМАДСТВА СТВАРАЕ ЯСЛІ І ІНШЫЯ ПАДОБНЫЯ ЎСТАНОВЫ. АПЕКА ГРАМАДСТВА НАДЗІМІ ЛЕПШАЯ ЗА АПЕКУ АСОБНЫХ ЛЮДЗЕЙ,

ЯКІЯ НЕ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ІХ БАЦЬКАМІ.

Калі правесці дослед, каб вызначыць натуральную схільнасць дзіцяці высветліць, каму яно аддае перавагу - маці ці дзіцячай ферме, дзіця без ваганняў выбярэ маці. Паколькі ад прыроды дзіця адчувае цягу да сваёй маці, то менавіта маці з'яўляецца для яго натуральнай і ідэальнай абаронай. Адрываць дзіця ад маці і адпраўляць яго ў яслі, значыць чыніць над ім насілле, перашкаджаць яго нармальнаму, натуральнаму памкненню.

Натуральнае развіццё - гэта нармальнае, свабоднае развіццё. Замена маці яслямі - насільнае дзеянне, якое супрацьдзейнічае свабодзе нармальнага развіцця. Дзеці, якіх адпраўляюць у яслі, ідуць туды альбо па прымусу, альбо па свайму дзіцячаму неразуменню, і адпраўляюць іх туды з прычыны выключна матэрыяльнага, а не сацыяльнага парадку. Калі не прымушаць і не скарыстоўваць іх наіўнасць, дзеці не пайшлі б у яслі, а засталіся б са сваімі маці. Гэтае негуманнае і ненатуральнае дзеянне мае толькі тое апраўданне, што жанчына пастаўлена ва ўмовы, якія не спрыяюць яе прыродзе, г. зн. яна вымушана выконваць функцыі несацыяльныя, што супярэчаць яе прызначэнню як маці.

Жанчына, якой з прычыны яе прыроды

ўласцівыя функцыі, якія адрозніваюцца ад функцый мужчыны, павінна быць пастаўлена ў іншыя, чым мужчына, умовы, каб мець магчымаць ажыццяўляць гэтыя натуральныя функцыі.

Мацярынства - функцыя, уласцівая жанчыне, а не мужчыне, таму, безумоўна, нельга адлучаць дзяцей ад маці. Любая спроба разлучыць іх з маці ёсць насілле і дэспатызм. Маці, якая выракаецца мацярынскіх абавязкаў, дзейнічае насуперак свайму жыццёваму прызначэнню, вызначанаму ёй прыродай. Ёй павінны быць забяспечаны ўсе неабходныя правы і спрыяльныя ўмовы, прычым усякае насілле з мэтай прымусіць жанчыну выконваць натуральныя функцыі ў ненармальных умовах павінна быць выключана. Адно ў гэтым выпадку супярэчыць другому. Вымушанае адмаўленне жанчыны ад выканання натуральнай функцыі па нараджэнню і выхаванню дзяцей азначае, што жанчына з'яўляецца ахвярай насілля і дэспатызму. Жанчына, якая павінна выконваць работу, якая робіць яе няздольнай ажыццяўляць сваю прыродную функцыю, несвабодная і прымушаецца да гэтага сваімі патрэбнасцямі, бо патрэбнасці вызначаюць свабоду.

Да ліку спрыяльных і абавязковых умоў, неабходных для таго, каб Жанчына магла

выконваць сваё натуральнае прызначэнне, якое адрозніваецца ад прызначэння мужчыны, адносяцца тыя ўмовы, якія неабходна стварыць хворай жанчыне, што знаходзіцца ў стане цяжарнасці, калі яна носіць у сваім лоне дзіця і гэта абмяжоўвае яе фізічныя магчымасці. Бесчалавечна ставіць жанчыну, якая знаходзіцца на гэтай стадыі мацярынства, ва ўмовы, несумяшчальныя з яе станам, напрыклад, прымушаць яе да фізічнай працы, якая з'яўляецца для жанчыны пакараннем за зраду свайму прызначэнню як маці, альбо падаткам, які яна плаціць за ўступленне ў чужы яе прыродзе свет мужчын.

Пераканне, якое раздзяляецца самой жанчынай, што яна займаецца фзіічнай працай па добрай волі, не адпавядае ісціне. На самой справе яна, сама таго не ўсведамляючы, займаецца ёю толькі таму, што жорсткае матэрыяльнае грамадства прымусіла яе падпарадкоўвацца гэтым умовам і паставіла яе ў безвыходныя ўмовы, хоць яна і думае, што свбодная выбраць. Аднак пры існуючым зараз прынцыпе роўнасці паміж мужчынай і жанчынай "ва ўсім" жанчына не мае свабоды выбару.

Вялікі падман у адносінах да жанчыны хаваецца ў самім выразе "ва ўсім", паколькі ён заводзіць

на нішто тыя першарадныя прыродныя асаблівасці, якія адрозніваюць жанчыну ад мужчыны і вызначаюць яе натуральнае месца ў жыцці.

Роўнасць паміж жанчынай і мужчынай у пераносцы цяжараў, калі жанчына знаходзіцца ў стане цяжарнасці, - дэспатызм і жорсткасць. Роўнасць паміж імі ў захаванні посту і звязаных з ім цяжкасцей у перыяд, калі жанчына корміць, - дэспатызм і жорсткасць. Роўнасць паміж імі пры выкананні брудной работы, згубнай для жаночай прыгажосці, несумяшчальнай з жаноцкасцю - дэспатызм і жорсткасць. Навучанне жанчыны прафесіі, якая асуджае яе на працу, што супярэчыць яе прыродзе, - таксама дэспатызм і жорсткасць. Мужчына і жапчына роўныя ва ўсім, што датычыць чалавечых адносін. Так, недапушчальна, каб той ці другі ўступаў у шлюб супраць сваёй волі ці без узаемнай згоды касаваў шлюб без суда. Жанчына з'яўляецца гаспадыняй дома, таму што дом - адзін з нармальных і абавязковых атрыбутаў жанчыны ў перыяд цяжарнасці, родаў і догляду за дзіцем. Жанчына - гаспадыня мацярынскага дома. Мацярынства - яе прыродны пачатак. Пазбаўляць дзяцей маці ці пазбаўляць жанчыну дома - дэспатызм.

Жанчына - асобіна жаночага полу, а гэта азначае,

што яе біялагічная прырода адрозніваецца ад прыроды мужчыны. Таму жанчына валодае якасцямі, якія ў корані адрозніваюцца ад якасцей мужчыны як па знешняму абліччу, так і па самой сутнасці. Жанчына знешне адрозніваецца ад мужчыны падобна таму, як жывёльным і раслінным свеце ўсякая асобіна жаночага полу адрозніваецца ад асобіны мужчынскага полу. Гэта бясспрэчны факт прыроды. Мужчынскія асобіны ў свеце раслін і жывёлін па прыродзе сваёй моцныя і грубыя, тады як жаночыя і ў свеце раслін, і ў свеце жывёлін, і ў свеце людзей па прыроде сваёй прыгожыя і пяшчотныя. Гэта спрадвечныя, агульнараспаўсюджаныя рэальнасці, у адпаведнасці з якімі створаны жывыя істоты, якія называюцца людзьмі, жывёламі, раслінамі.

Па розніцы ў складзе адпаведна законам прыроды мужчынская асобіна з'яўляецца носьбітам грубай сілы таму, што яна створана менавіта для гэтага, а жаночая, таксама па прыродзе, з'яўляецца носьбіткай прыгажосці і пяшчоты, таму што створана для гэтай ролі. Гэта натуральнае правіла справядлівае, бо, з аднаго боку, яно натуральнае, а з другога - з'яўляецца асноўным правілам свабоды, паколькі ўсё існае створана свабодным, тады як любое ўмяшанне, якое супярэчыць правілу свабоды, ёсць

дэспатызм. Пагарджанне прыроднымі асаблівасцямі, самавольны выхад за іх межы азначае папіранне каштоўнасцей самога жыцця і яго знішчэнне. Менавіта так усё створана прыродай у адпаведнасці з непахіснымі яе законамі ад моманту нараджэння да смерці. Усякая жывая істота нараджаецца, жыве і памірае. Усё жыццё ад пачатку да канца асноўваецца на натуральным законе прыроды, які не ставіць мэтай ні прымусу, ні выбару. Ён натуральны, у ім закладзена натуральная свабода. У свеце жывёл, раслін, людзей у адпаведнасці са спрадвечным цячэннем жыцця абавязкова існуюць мужчынскія і жаночыя асобны. Яны не толькі існуюць, але і абавязкова ажыццяўляюць функцыі, для якіх яны створаны і якія павінны выконвацца ў поўнай меры. Калі ж гэтага няма, значыць, з-за нейкіх абставін натуральнае цячэнне жыцця парушана. Аднак амаль усюды ў свеце ролі жанчыны і мужчыны ў жыцці чалавечай супольнасці, у выніку спроб ператварыць жанчыну ў мужчыну, змешваюцца. Гэта - насілле над прыродай, якая прадвызначыла, што кожнаму - і мужчыне, і жанчыне - належыць свая асаблівая роля, інакш гэта - рэгрэс. Гэта тэндэнцыя супярэчыць прыродзе, яна разбурае правіла свабоды, накіравана супраць жыцця і законаў існавання.

Мужчына і жанчына павінны няўхільна выконваць прызначаную ім ролю, дзеля якой яны з'явілся на свет. Усякае, хоць бы і частковае, адступленне ад вызначанай ім ролі, тлумачыцца толькі вымушаннымі, выключнымі абставінамі, г. зн. адбываецца з прычыны ненармальных умоў. Жанчына, якая пазбягае цяжарнасці ці шлюбу, або ўтрымліваецца ад натуральнага імкнення быць прыгожай і пяшточнай па стану здароўя, адмаўляецца ад свайго прыроднага прызначэння па прычынах вымушана характару. Жанчына, якая пазбягае цяжарнасці, шлюбу, мацярынства і г. д. з-за сваёй работы, адступаецца ад сваёй натуральнай функцыі таксама з-за вымушаных абставін. Жанчына, якая пазбягае цяжарнасці, шлюбу, мацярынства і г. д без яўных прычын, адмаўляецца выконваць сваю прыродную ролю з-за вымушаных абставін маральнага парадку.

Такім чынам, нежаданне мужчыны ці жанчыны выконваць сваё прыроднае жыццёвае прызначэнне можа мець месца толькі ў ненармальнах умовах, якія супярэчаць закону свабоды і пагражаюць самому чалавечаму існаванню. Таму, каб пакончыць з матэрыяльнымі ўмовамі, якія перашкаджаюць жанчыне выконваць сваё натуральнае прызначэнне і прымушаюць яе займацца

мужчынскай працай у імя прынцыпу роўнапраўя з мужчынай, неабходна ажыццявіць пераварот у сусветным маштабе. Няма сумнення ў тым, што такі пераварот, асабліва ў прамыслова развітых грамадствах, з-за інстынкту самазахавання непазбежны. Ён адбудзецца нават без уплыву знешніх крыніц агітацыі, такіх як Зялёная Кніга.

УСЕ ІСНУЮЧЫЯ ЗАРАЗ ГРАМАДСТВЫ БАЧАЦЬ У ЖАНЧЫНЕ ТОЛЬКІ ТАВАР. УСХОД РАЗГЛЯДАЕ ЯЕ ЯК ПРАДМЕТ КУПЛІ-ПРОДАЖУ, ЗАХАД ЖА АДМАЎЛЯЕЦЦА ПРЫЗНАВАЦЬ У ЁЙ ЖАНЧЫНУ.

Прымушаць жанчыну выконваць мужчынскую работу - значыць замахвацца на жаноцкасць, адпушчаную ёй прыродай дзеля неабходнасці працягу жыцця. Мужчынская работа падаўляе прыгажосць, якой прырода надзяліла жанчыну для выканання яе асноўнага прызначэння. Жанчына не створана для неўласцівай ёй працы. Аналогія гэтага - суквецці раслін, якія існуюць для таго, каб абдываўся працэс апыления і паяўлялася насенне: калі знічшыць кветку, расліна згубіць здольнасць выконваць сваё жыццёвае прызначэнне. Яркая прыродная афарбоўка самак матылёў, птушак і іншых прадстаўнікоў жывёльнага свету створана

прыродай у імя вялікай мэты жыцця. Між тым, займаючыся мужчынскай працай, адмаўляючы сваё прыроднае прызначэнне і пагарджаючы прыгажосцю, уласцівай ёй як жанчыне, жанчына ператвараецца ў мужчыну. Жанчына павінна валодаць поўнымі правамі, выключаючы права на ператварэнне ў мужчыну і адмаўленне ад сваёй жаноцкасці.

З прычыны рознага фізічнага складу функцыі органаў мужчыны і жанчыны таксама розныя. Адрозненне гэтых функцый абумовіла рознасць тэмпераменту, псіхічнага складу, нервовай сістэмы і целаскладу. Жанчына эмацыянальная, прывабная, плаксівая, баязлівая. Прырода стварыла жанчыну пяшчотнай і слабай, мужчыну - жорсткім і грубым.

Ігнараванне натуральных адрозненняў паміж жанчынай мужчынай, змяшанне іх прызначэння - тэндэнцыя, якая цалкам супярэчыць устоям цывілізацыі і вечным законам прыроды. Яна падрывае асновы жыцця чалавека і з'яўляецца сапраўднай прычынай усіх бед у яго грамадскім жыцці.

Сучасныя індустрыяльныя грамадства, якія прыстасавалі жанчыну для выканання мужчынскай фізічнай работы на шкоду яе жаноцкасці, яе натуральнаму жыццёваму прызначэнню як маці і крыніцы прыгажосці

спакою, - гэта не цывілізованыя, а матэрыялістычныя грамадствы, перайманне прыкладу якіх неразумнае і небяспечнае для чалавецтва і цывілізацыі.

ПЫТАННЕ НЕ Ў ТЫМ, ПАВІННА ЦІ НЕ ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ ЖАНЧЫНА, ПАДОБНАЯ ПАСТАНОЎКА ВУЛЬГАРНАЯ І АБСУРДНАЯ, ПАКОЛЬКІ ГРАМАДСТВА АБАВЯЗАНА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ РАБОТАЙ УСІХ СВАІХ ЗДОЛЬНЫХ ДА ПРАЦЫ ЧЛЕНАЎ, І МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ. СПРАВА Ў ТЫМ, ШТО КОЖНЫ ПАВІНЕН ВЫКОВАЦЬ ТАКУЮ РАБОТУ, ЯКАЯ ЯМУ ПАДЫХОДЗІЦЬ, І НЕ ПАВІНЕН ПРЫМУШАЦЦА ДА ВЫКАНАННЯ НЕПАДЫХОДЗЯЧАЙ ДЛЯ ЯГО РАБОТЫ.

ПРЫМУШАЦЬ ДЗЯЦЕЙ ВЫКОНВАЦЬ РАБОТУ ДАРОСЛЫХ - ДЭСПАТЫЗМ ІНАСІЛЛЕ. ПРЫМУШАЦЬ ЖАНЧЫНУ ВЫКОНВАЦЬ РАБОТУ МУЖЧЫНЫ - ТАКСАМА ДЭСПАТЫЗМ ІНАСІЛЛЕ.

Свабода азначае, што чалавек валодае ведамі і навыкамі, якія адпавядаюць ягонай прыродзе, робяць яго здольным выконваць адпаведную работу.

Дэспатызм азначае, што чалавек валодае ведамі і ўменнямі, якія не адпавядаюць яго прыродным даным, штурхаюць яго да выканання не

адпавядаючай яму работы. Не заўсёды работа, якую можа выканаць мужчына, падыходзіць для жанчыны. Веды і ўменні дзіцяці адрозніваюцца ад ведаў і ўменняў дарослага чалавека.

Чалавечыя правы роўныя для ўсіх - мужчын і жанчын, дарослых і дзяцей. Аднак абавязкі і х далёка не роўныя.

МЕНШАСЦІ

МЕНШАСЦІ

Што такое меншасць, якія яе правы і якія абавязкі? Якія шляхі вырашэння гэтай праблемы прапануе Трэцця Сусветная Тэорыя ў рамках вырашэння астатніх праблем чалавека?

Існуе два тыпы меншасцей - меншасць, якая злілася з нацыяй і стала яе сацыяльнай часткай, і меншасць, якая не мае сваёй нацыі. Апошняя ўяўляе сабой самастойны грамадскі арганізм і з'яўляецца супольнасцю, якая гістарычна складалася і якая пад уплывам фактараў далучэння і агульнасці лёсу з часам стане нацыяй.

Гэтая меншасць мае, як ужо паказана, суверэнныя грамадскія правы. Замах на гэтыя правы з боку любой большасці ёсць дэспатызм. Грамадская самабытнасць - уласцівасць гэтай меншасці, яна не можа быць ні падаравана, ні адаравана.

Палітычныя і эканамічныя праблемы такой меншасці могуць быць вырашаны толькі ва ўмовах грамадства, якім кіруюць масы, дзе

ўлада, багацце і зброя належаць масам. Разглядаць меншасць толькі з боку палітычных і эканамічных праблем - дыктат і несправядлівасць.

ЧОРНЫЯ

ЧОРНЫЯ

ПРАВІЦЬ СВЕТАМ БУДУЦЬ ЧОРНЫЯ

Занявольванне чорнай расы белай расай было апошнім этапам у гісторыі рабства. Памяць пра гэта захаваецца ў свядомасці сорнага чалавека да таго часу, пакуль ён не зразумее, што цалкам аднавіў свае правы.

Гэты трагічны факт гісторыі, нараджаемае ім пачуццё болю і псіхалагічнае імкненне да самасцвярджэння і рэаблітацыі з боку цэлай расы ўяўляе такі псіхалагічны фактар, значэнне якога, улічваючы імкненне чорнай расы да рэваншу і панавання, нельга скідаць з рахунку. Акрамя гэтага, неабходна ўлічваць і такія фактары гістарычнага грамадскага працэсу, як панаванне жоўтай расы, якая прыйшла з Азіі і захапіла іншыя кантыненты, а затым і панаванне белай расы, якая каланізавала цэлыя мацерыкі. Цяпер наступае перыяд панавання чорнай расы. З сацыяльнага пункту гледжання, чорная раса

зараз знаходзіцца ў вельмі адсталым стане. Аднак гэтая адсталасць садзейнічае колькаснай перавазе чорнай расы, паколькі нізкі ўзровень жыцця пазбавіў чорных магчымасці выкарыстоўваць сродкі, якія абмяжоўваюць дзетараджэнне. Акрамя гэтага, з-за адсталасці грамадскіх звычаяў чорным невядомыя абмежаванні ў сферы шлюбных адносін, што вядзе да неабмежаванага росту чорнага насельніцтва. У той жа час іншыя расы з прычыны рэгулявання дзетараджэння і дзеючага заканадаства аб шлюбе колькасна скарачаюцца. Гэта таксама вынік іх пастаяннай занятасці ў супрацьлегласць чорным, якія вядуць бяздзейны лад жыцця ў атмасферы вечнай свабоды.

АДУКАЦЫЯ

АДУКАЦЫЯ

Набыццё ведаў - гэта не той рэгламентаваны працэс і не тыя матэрыялы, зафіксаваныя ў падручніках, якія моладзь вымушана на працягу пэўных гадзін завучваць у навучальных аўдыторыях. Такі метад навучання, прыняты цяпер ва ўсім свеце, супярэчыць свабодзе. Абавязковае навучанне, якім выхваляюцца дзяржавы свету, што здолелі навязаць яго моладзі, з'яўляецца сродкам падаўлення свабоды, падаўлення прыродных здольнасцей чалавека. Прымус пры выбары прафесіянальнай арыентацыі ўяўляе сабою дыктат, згубны для свабоды, паколькі ён пазбаляе чалавека права свабоднага выбару, творчасці і праяўлення таленту. Прымусіць чалавека вывучаць якую-небудзь дысцыпліну на праграме - дыктат. Навязваць людзям вывучэнне пэўных прадметаў - дыктат.

Абявязковае рэгламентаванае навучанне на

праграмах азначае на справе прымусовае насаджэнне невуцтва сярод мас. Усе дзяржавы, якія зводзяць працэс-навучання ў рамкі афіцыйных праграм і прымушаюць сваіх грамадзян навучацца выключна ў межах афіцыйна ўстаноўленых і адобраных прадметаў і дысцыплін, здзяйсняюць над сваімі грамадзянамі насілле. Сусветная культурная рэвалюцыя павінна знішчыць прынятыя зараз у свеце метады навучання і вызваліць чалавечую свядомасць ад тэндэнцыёзных праграм і наўмыснай намыснай перабудовы густаў, паняццяў і настрою думак чалавека.

Сказанае не азначае, як можа здацца некаторым вульгарызатарам, што трэба закрыць навучальныя ўстановы і пазбавць людзей магчымасці вучыцца. Наадварот, гэта азначае, што грамадства павінна забяспечыць адукацыю ўсіх відаў і даць сваім грамадзянам магчымасць выбраць такі від, які больш адпавядае іх прыродзе, што, у сваю чаргу, патрабуе наяўнасці дастатковай колькасці навучальных ўстаноў ва ўсіх галінах ведаў. Недахоп іх абмяжоўвае свабоду чалавека, прымушае яго вывучаць дысцыпліны, прадстаўленыя ў існуючых навучальных установах, і тым самым пазбаўляе яго натуральнага права свабоднага выбару, паколькі навучальных устаноў па іншых галінах

ведаў не існуе.

Грамадства, якое закрывае шлях да ведаў ці манапалізуе гэтыя веды - гэта адсталае, вельмі некультурнае і варожае свабодзе грамадства. Такімі ж адсталымі, вельмі некультурнымі і варожымі свабодзе з'яўляюцца грамадствы, якія перашкаджаюць сапраўднаму веданню веры, грамадства, манапалізуюць рэлігійныя веды, грамадствы, якія прадстаўляюць чужую рэлігію, культуру і лад жыцця ў скажоным выглядзе, і тыя грамадствы, у якіх матэрыялістычныя веды знаходзяцца пад забаронай або манапалізованы імі. Веданне - натуральнае права кожнага чалавека, і ніхто не павінен пазбаўляць чалавека гэтага права, толькі сам чалавек можа адмовіцца ад яго.

Некультурнасці наступіць канец, калі сё будзе прадстаўлена ў сапраўдным свеце калі кожны чалавек будзе мець магчымасць пазнавасць ісціну даступным для сябе шляхам.

МУЗЫКА І МАСТАЦТВА

МУЗЫКА І МАСТАЦТВА

Людзі будуць адсталымі, пакуль не змогуць гаварыць на адной мове. Да таго часу, пакуль чалавек не здолее ажыццявіць гэтую мару, якая ўяўляецца неажыццявімай, - кожны народ будзе выражаць радасць і сум, дабро і зло, прыгажосць і агіднасць, спакой і пакуты, смерць і бессмяртнасць, любоў і нянавісць, адным словам, будзе праяўляць усю разнастайнасць пачуццяў, густаў і настрояў на сваёй мове, якую ёе засвойвае па прыродзе. Тым больш, што самі паводзіны чалавека будуць вызначацца рэакцыяй, выкліканай эмацыянальным успрыманне, якое ствараецца мовай у душы яго носьбіта.

Прыняцце адной мовы ў наш час не вырашае гэтай праблемы. Пытанне гэтае будзе вырашана толькі тады, калі працэс зліцця моў пройдзе

шэраг стадый, на што будзе затрачана жыццё не аднаго пакалення пры ўмове, што з цягам часу гэтыя пакаленні страцяць фактар спадчыннасці. Пачуццёвыя ўспрыманні, густ і тэмперамент дзядоў і бацькоў ствараюць пачуццёвыя ўспрыманні, густ і тэмперамент сыноў і бацькоў ствараюць пачуццёвыя ўспрыманні, густ і тэмперамент сыноў і ўнукаў. Калі продкі размаўлялі на розных мовах, а нашчадкі размаўляюць на адной, дык гэта не значыць, што нашчадкі, размаўляючы на адной мове, маюць агульныя густы і адны тыя ж эмацыянальныя ўспрыманні. Адзіныя эстэтычныя адносіны могуць з'явіцца толькі пасля таго, як новая мова створыць генетычны фактар перадачы густу і пачуццёвых устрыманняў ад пакалення да пакалення.

Калі адна група людзей носіць з выпадку жалобы белае, а другая - чорнае, дык і эмацыянальнае ўспрыманне гэтага колеру кожнай групай будзе адпаведным, г. зн. для адной адмоўныя эмоцыі заўсёды будуць звязаны з чорным колерам, а для другой - з белым. Такая эмацыянальная рэакцыя аказвае канкрэтнае ўздзеянне на арганізм у цэлым, прычым гэтае ўспрыманне перадаецца ў спадчыну, таму наступнае пакаленне будзе інстынктыўна не любіць чорны колер, таму што яго не любіла

папярэдняе пакаленне. З прычына гэтага кожны народ у стане па-сапраўднаму ўспрымаць толькі ўласнае нацыянальнае мастацтва і нацыянальную спадчыну і па прычынах генетычных не ўспрымае чужыя мастацтвы і спадчыну нават у тых выпадках, калі народы, якія маюць розную культурную спадчыну, у гэты час размаўляюць на адной мове. Гэтае адрозненне, хоць і ў слабай форме, праяўляецца нават унутры аднаго народа.

Навучыцца адзінай агульнай мове нацяжка, таксама ж як няцяжка, ведаючы мову іншых народаў, навучыцца разумець іх мастацтва. Цяжкасць заключаецца ў немагчымасці сапраўднага эмацыянальнага зліцця на аснове чужой мовы. Гэта праблема, будзе існаваць, пакуль не знікне ўздзеянне фактара спадчыннасц на людзей, якія размаўляюць на адной мове.

Чалавецтва будзе ў сапраўдным сэнсе знаходзіцца ў стане адсталасці, пакуль людзі не загавораць на адзінай агульнай мове, прычым не вывучанай, а атрыманай у спадчыну ад бацькоў.

Тым не менш, дасягненне гэтай мэты пры ўмове няхільнага развіцця чалавечай цывілізацыі - усяго толькі пытанне часу.

СПОРТ, ВЕРХАВАЯ ЯЗДА, ВІДОВШЧЫ

СПОРТ, ВЕРХАВАЯ ЯЗДА, ВІДОВІШЧЫ

Спорт можа быць індывідуальным як малітва для чалавека ў поўнай адзіноце, нават у зачыненым пакоі, альбо калектыўным, калі спартыўныя гульні праводзяцца на адкрытых пляцоўках накшталт таго, як масавыя малітвы здзяйсняюцца ў храмах. У першым выпадку спорт з'яўляецца заняткам індывідуальным, у другім - масавым, паколькі ім займаецца ўвесь народ, не перадаверачы гэты занятак нікому іншаму. Было б неразумна, калі б людзі хадзілі ў храм не для таго, каб маліцца самім, а для таго, каб паглядзець, як моляцца іншыя. Настолькі ж неразумна, калі натоўп людзей ідзе на стадыёны і спартыўныя пляцоўкі не для ўдзелу ў спартыўных гульнях, а дзеля таго, каб паглядзець выступленні якога-небудзь спартсмена ці групы спартсменаў.

Спорт падобны да малітвы, ежы, апранання,

свежага паветра. Людзі не ходзяць у рэстаран, каб глядзець, як ядуць іншыя. Недарэчна таксама ўявіць сабе людзей, якія даручылі іншым замест сябе грэцца ля вогнішча ці асвяжацца ля вентылятара. Настолькі ж недарэчна, калі грамадства дазваляе асобнаму чалавеку або групе людзей манапалізаваць спорт, адхіліўшы ад яго грамадства, прычым грамадства аплачвае ўсе расходы спартсмена-адзіночкі або групы спартсменаў. З дэмакратычнага пункту гледжэння гэта настолькі ж недапушчальна, як недапушчальна, каб народ дазваляў асобнаму чалавеку ці групе людзей - партыі, класу, клану, племені, парламенту выражаць ад імя народа яго лёс альбо вызначаць яго патрэбнасці.

Індывідуальны спорт - справа тых, хто ім займаецца. Яны займаюцца ім па ўласнай ініцыятыве і самі павінны несці расходы. Масавы спорт - гэта сацыяльная патрэбнасць людзей, таму недапушчальна як са спартыўнага, так і дэмакратычнага пунктаў гледжання перадаваць заняткі спортам іншым асобам. Са спартыўнага пункту гледжання, ніводны чалавек не ў стане перадаць іншым тое духоўнае і фізічнае задавальненне, якое ён адчуў, займаючыся спортам. З дэмакратычнага пункту гледжання, ніводня чалавек ці група людзей не маюць права манапалізаваць спорт, уладу,

багацце, зброю, адхіліўшы ад гэтага астатніх. Традыцыйнай асновай сучаснага спорту ва ўсіх дзяржавах свету з'яўляюцца спартыўныя клубы, у распараджэнні якіх знаходзяцца ўсе сродкі і магчымасці ў галіне спорту. Гэтыя арганізацыі ўяўляюць сабой такія ж сацыяльныя манапалістычныя інстытуты, што і інстытуты палітычнай дыктатуры, якія манапалізуюць уладу ад імя мас, эканамічныя інстытуты, якія манапалізуюць багацці, адабраныя ў грамадства, традыцыйныя ваенныя інстытуты, якія манапалізуюць зброю, адабраную ў грамадства. Накшталт таго, як эпоха мас разбурае інстытуты, якія манапалізуюць багацці, і уладу зброю, яна павінна разбураць і інстытуты, якія манапалізуюць сацыяльную актыўнасць, - заняткі спортам, верхавой яздой і да т. п. Калі масы народа выстрайваюцца ў чэргі, каб падтрымаць кандыдата, які будзе замест іх вырашаць іх лёс ці - калі ўявіць яшчэ больш неверагоднае - стане замест іх і па іх даручэнні носьбітам іх годнасці, суверэнітэту г. д., дык гэтым масам, пазбаўленым волі і годнасці, застаецца толькі назіраць, як хтосьці дзейнічае там, дзе звычайным парадкам яны павінны дзейнічаць самі. Аналагічнае адбываецца з тымі людзьмі, якія не займаюцца спортам самі і для сябе, паколькі няздольныя займацца ім з-за

няўмення ці ашуканства з боку арганізацый, якія манапалізавалі заняткі спортам і імкнуцца пазбавіць масы і прытупіць іх свядомасць, пакінуўшы ім замест заняткаў спортам толькі смех і апладысменты. Калі ўлада належыць масам, спорт становіцца масавым. Калі багацці і зброя належаць масам, спорт як адзін з відаў сацыяльнай актыўнасці таксама належыць масам.

Калектыўны спорт - справа мас. Улічваючы карысць, якую спорт прыносіць як сродак аздараўлення і забавы, спорт - гэта права ўсяго народа. Неразумно ператвараць спорт выключна ў здабытак адзіночак ці асобных груп людзей, дазволіўшы ім асабіста выкарыстоўваць аздараўленчы і маральны бакі спорту, у той час як масы будуць забяспечваць іх усім неабходным і аплачваць усе расходы.

Тысячы гледачоў, што запоўнілі трыбуны стадыёнаў, апладзіруюць і смяюцца, - гэта тысячы ўведзеных у падман людзей, якія, не маючы магчымасці займацца спортам асабіста, бяздзейна сядзяць на трыбунах і апладзіруюць чэмпіёнам, якія перахапілі ў іх ініцыятыву, адцяснілі іх і манапалізавалі спорт, скарыстоўваючы ў сваіх інтарэсах магчымасці, прадстаўленыя ім масамі. Трыбуны стадыёнаў існуюць толькі для таго, каб закрыць масам

доступ на спартыўныя палі і да спартыўных збудаванняў, не даць масам магчымасці займацца спортам. Трыбуны стадыёнаў апусцеюць і знікнуць тады, калі масы, усвядоміўшы, што спорт - гэта від сацыяльнай актыўнасці, рынуцца на спартыўныя арэны і пачнуць займацца спортам, выступаючы ў якасці ўдзельнікаў, а не гледачоў. Больш разумным было б прадставіць адваротнае, а менавіта, каб у ролі пасіўных гледачоў выступала меншасць, не здольная займацца спортам.

Трыбуны стадыёнаў знікнуць, калі на іх не будзе каму сядзець.

Тэатральныя і канцэртныя залы запаўняюць людзі несур'ёзныя, няздольныя іграць у жыцці гераічную ролю, тыя, хто не разумее сэнсу гістарычных падзей і не ўяўляе сабе будучага. Гэтыя гультаі прыходзяць у тэатры і глядзельныя залы, каб паглядзець, як цячэ жыццё, і павучыцца накшталт таго, як гэта робяць вучні, што запаўняюць школьныя класы.

Творцам жыцця не да твару сачыць за тым, як акцёры на сцэне падаюць жыццё. Гэтаксама коннікі не сядзяць на трыбунах у час скачак. Калі б кожны меў каня, дык не знайшлося б жадаючых назіраць за скачкамі і апладзіраваць іх удзельнікам. Гледачы, якія сядзяць, - гэта тыя,

хто не могуць самі займацца гэтым відам спорту, таму што не ўмеюць ездзіць вярхом.

Качавыя народы не ведаюць тэатра і відовішчаў, таму што жыццё іх гранічна суровае запоўненае працай, яны сур'ёзна ўспрымаюць жыццё, ім смешныя ўсялякія імітацыі жыцця. Гэтыя людзі не глядзяць спартыўныя спаборніцтвы, а аддаюцца радасцям масавага ўдзелу ў іх, таму што яны адчуваюць стыхійную патрэбнасць удзельнічаць у такіх выступленнях самім.

Бокс і розныя віды барацьбы сведчаць, што чалавецтва яшчэ не канчаткова пазбавілася ад перажыткаў варварства. Аднак калі чалавек узнімецца на больш высокую ступень цывілізацыі, гэта непазбежна адбудзецца. Дуэлі на пісталетах, а да гэтага чалавечыя ахвярапрынашэнні таксама былі звычайнымі з'явамі ў жыцці чалавечага грамадства. Але вось ужо сотні гадоў, як гэтыя варварскія з'явы бясследна зніклі. Цяпер людзі з усмешкай і сарамлівасцю спамінаюць, што яны калісьці займаліся такімі рэчамі. Тое ж самае адбудзецца праз дзесяткі ці сотні гадоў з боксам і барацьбой. Аднак самыя адукаваныя і інтэлектуальна развітыя людзі ўжо зараз пазбягаюць гэтых варварскіх відаў спорту, не жадаючы быць ні ўдзельнікамі, ні гледачамі падобных выступленняў.

اللغة البيلوروسية

Мулявіп Кайлаві

Зялёная Кніга

اللغة البيلوروسية